Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 ЖНІЎНЯ 2015 г. ПЯТНІЦА № 159 (28017) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Першы раз — у першы клас

СТАР. 4



Аляксандр Дасужаў, ці проста DOS

СТАР. 13



Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

ЛІЧБА ДНЯ

77,6%

запланаванага на год жылля ўведзена ў эксплуатацыю сёлета ў студзені-ліпені. Арганізацыямі ўсіх форм уласнасці пабудавана 33,4 тысячы новых кватэр. Для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 1 261,3 тысячы кв.м агульнай плошчы, або 40,6% ад агульнага аб'ёму ўведзенага жылля. У параўнанні са студзенем-ліпенем 2014-га ўвод у эксплуатацыю жылля для грамадзян гэтай катэгорыі зменшыўся на 334,1 тысячы кв.м. У сельскіх населеных пунктах уведзена ў эксплуатацыю 892,9 тысячы кв.м агульнай плошчы жылля, або 28,8% ад агульнага ўводу па рэспубліцы.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.08.2015 г.

Долар ЗША	16 498,00	▲
Еўра	18 337,00	▲
Рас. руб.	246,30	▼
Укр. грыўня	743,99	▲

ISSN 1990 - 763X

СВОЙ КУТОК

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Аляксандр КАТАНЕКША працуе механізатарам ў сельскагаспадарчым прадпрыемстве «Эксперыментальная база імя Катоўскага» Уздзенскага раёна. Яго жонка Юлія — у дэкрэтным адпачынку. Сужэнцы выхоўваюць дваіх дзяцей. Аляксандры пяць гадоў, а яе малодшаму браціку Арцёму споўнілася два.

Гэтай вясной у маладой сям'і нарэшце з'явілася сваё жыллё: гаспадарка выдзеліла новы дыхтоўны катэдж у вёсцы Возера: тры жылыя пакоі, кухня, калідор, цэнтралізаванае водазабеспячэнне, газ, каля дома ладны ўчастак зямлі. Юлія і Аляксандр ужо абсталявалі дом усім неабходным: збіралі грошы на мэблю, бытавую тэхніку.

— Толькі той, хто ніколі не меў жылля, можа адчуць, якая гэта радасць — свой куток, — распавяла гаспадыня. — Пяць гадоў таму мы вырашылі пераехаць з Мінска, дзе муж працаваў на трактарным заводзе, у вёску. А чаго трымацца за той горад, калі не мелі ўласнай кватэры, а пабудаваць кааператыўную не было магчымасці. Нават пакой у інтэрнаце нам прадпрыемства не змагло выдзеліць — чарга. Даводзілася арандаваць жылплошчу ў чужых людзей.

— У наступным годзе мяркуем пасадзіць фруктовыя дрэўцы, разбіць газоны, паставіць цяпліцу, завесці хатнюю жывёлу, — дзеліцца сваімі планамі Юлія.

У горад, як прызнаюцца муж і жонка, іх не зацягнеш і на вяроўцы. Тут прастора, чыстае паветра, ёсць работа, дах над галавой. На жыццё грэх скардзіцца.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

■ Дашкольны лікбез

ПЯЦЬ ЗЯЛЁНЫХ МАКАРОН...

Калі першакласнік не хоча вучыцца, значыць, ён не нагуляўся

Хадзіць у школу і вучыцца — дзве розныя рэчы. На жаль, часам, гэта высвятляецца толькі пасля таго, як першакласнік аказваецца не ў стане ўспрымаць сябе ў новым статусе і не разумее, чаго ад яго ўвогуле хочуць. Што ж павінна ўмець і ведаць дзіця, знаходзячыся на «парозе школы»? Як даведацца, што яно псіхалагічна падрыхтавана да сустрэчы з новым, і што рабіць, каб не аддаць у школу гультая?

МАЛЕНЬКІЯ ПАПЯЛУШКІ І МАМА-СУДДЗЯ

Хітрыкамі выхавання ў малых жадання вучыцца падзялілася **Васіліна ЖАРНАК, выхавацель 1-й кваліфікацыйнай катэгорыі дзіцячай установы № 218 г. Мінска.**

— Часта дзеці на пытанне «Чаму ты хочаш у школу?» адказваюць: «Там можна насіць прыгожы ранец»... Там вучыцца мой брат». Але ніводзін не кажа, што хоча ў школу, каб атрымаць новыя веды, і задача бацькоў і выхавацеляў — сфарміраваць правільную матывацыю на праяўленне цікавасці да вучобы. Каб прывіць малечы неабходныя для вучня ўвагу, уседлівасць, памяць, дапытлівасць, дастаткова штодня з імі гуляць і размаўляць на розныя тэмы. Калі дзеці задаюць нейкае пытанне, я часткова адказваю на яго, а потым дадаю, што больш грунтоўна ім пра гэта раскажа настаўнік у школе, які ведае больш за мяне і растлумачыць цікавей.

Каб праверыць і замацаваць памяць, а таксама папоўніць слоўнікавы запас дзяцей, я гуляю з імі ў словы. Для кожнага па чарзе называю 10 прадметаў і прашу паўтарыць, што запомніў. Калі малое ў стане ўзнавіць ад трох да шасці назваў, значыць, памяць добрая. Прапаноўваю адшукаць лішнюю картачку ў шэрагу малюнкаў і патлумачыць, чаму менавіта яна не падыходзіць да астатніх. Гэта выдатна развівае логіку. Самастойныя гульні з цацкамі — таксама важны момант, бо дзеці разам нешта прыдумваюць. Я дазваляю прыносіць свае, каб прывучаць іх дзяліцца адно з адным.. Але на некаторыя цацкі ў мяне забарона. Чаму вучаць, напрыклад, модныя лялькі-монстры?

Каб развіць мысленне і фантазію малых, выхавацелі праводзяць «навуковыя» эксперыменты. Дзеці даследуюць, як мяняецца вада, калі ў яе дабавіць фарбы, каштуюць вадкасць у падсалоджаным ці падсоленым выглядзе, з завязанымі вачыма на пах або смак вызначаюць часнок, апельсін, лімон. Гэтую справу можна з поспехам працягваць і дома. Напрыклад, паказаць станы вады: звычайны, замарожаны, пар з кіпню.

СТАР. 4

■ Надвор'е

ЦЁПЛА І СУХА

Цёплае і сухое надвор'е захаваецца ў Беларусі да сярэдзіны наступнага тыдня. Аб гэтым паведаміў начальнік аддзела метэаралагічных прагнозаў Аляксандр БЯГАНСКІ.

У суботу ў большасці раёнаў краіны ападкі не прагназуюцца, толькі днём месцамі па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці магчымы кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ноччу складзе 6-13 градусаў, днём — ад 20 да 27. У нядзелю ападкаў таксама не чакаецца. Ноччу будзе ад 6 да 13, па паўднёвым захадзе месцамі да 15 радусаў, днём — 22-27 градусаў цяпла.

У пачатку наступнага тыдня, 24-25 жніўня, будзе без ападкаў. Тэмпература паветра ноччу — 8-15 градусаў, днём — ад 20 да 27, месцамі да 29 градусаў.

У сувязі з працяглым перыядам сухога надвор'я захоўваецца складаная пажаранебяспечная абстаноўка ў лясах

ДЫКТАТ «СЕТАК» НЕДАПУШЧАЛЬНЫ

Прэзідэнт запатрабаваў навядзення строгага парадку ў сферы вытворчасці і абароту алкагольнай прадукцыі

Аб гэтым Аляксандр Лукашэнка заявіў учора на нарадзе па пытаннях вытворчасці і абароту алкагольнай прадукцыі, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка, у прыватнасці, крытыкаваў урад за нерашучасць у прыняцці мер па абароне ўнутранага рынку ад паступлення няякаснай алкагольнай прадукцыі. «Была пастаўлена задача не дапускаць на ўнутраны рынак паступлення няякаснай прадукцыі, скараціць ценявы абарот алкагольных напіткаў. Гэта не толькі страта бюджэту, але ў першую чаргу пагроза здароўю і жыццю людзей», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што алкагольная прадукцыя — гэта асаблівы падакцызны тавар, абарачэнне якога ва ўсім свеце строга рэгулюецца дзяржавай. «Не выключэнне і наша краіна. Мы пастаянна трымаем на кантролі гэту тэму. Увялі манаполію дзяржавы па ўсіх гэтых пытаннях. Так гэта ці не так — гэта першае пытанне, на якое трэба будзе адказаць дакладчыкам», — сказаў Прэзідэнт.

Ён нагадаў, што 1 ліпеня бягучага года спецыяльнымі ўказам і дэкрэтам Прэзідэнта ўведзены дадатковыя ахоўныя меры па ўзмацненні дзяржаўнага рэгулявання ў сферы вытворчасці і абароту алкагольнай прадукцыі.

Аднак, як падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка, у гэтай сферы ўсё яшчэ захоўваюцца пэўныя негатыўныя тэндэнцыі. У прыватнасці, павялічваецца імпарт спіртнога, расце яго нелегальны абарот, і ў той жа час скарачаецца айчынная вытворчасць. «На жаль, урад паводзіць сябе вельмі нерашуча ў прыняцці мер па абароне ўнутранага рынку. Гэта нікуда не варта», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Ён запатрабаваў ад дакладчыкаў дакладных адказаў на шэраг пытанняў. У прыватнасці, што перашкаджае абараніць уласны рынак? Чаму экспарт не расце, а падае, хоць магутнасці па вытворчасці алкаголю ў два разы перасягаюць унутраныя патрэбнасці? Якія меры прымаюцца для прасоўвання беларускай прадукцыі ў гандлёвыя сеткі ў краіне і за мяжой?

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што цяпер задача не шукаць апраўдання, чаму пагаршаецца становішча галіны, а прыняць канкрэтныя меры для абароны людзей. «Навядзенне строгага парадку ў сферы вытворчасці і абароту алкагольнай прадукцыі — прамы абавязак дзяржавы. Мы не павінны дапусціць, каб беларускі народ губілі няякаснымі падробкамі і нізкапробным кантрафактам», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Акцызная палітыка, якую прапаноўваў урад і сёння прапануе, практычна ўгробіла, як кажуць спецыялісты, галіну. Акцызы прывялі да павелічэння цаны і разам з кантрафактам да зніжэння попыту на гэтую прадукцыю, а значыць страты бюджэту», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Ён таксама падкрэсліў: «Прыватныя структуры за кошт паваротлівасці і за кошт невядома якіх фактараў (аж да хабараў і ўзаконьвання нейкіх хабараў і надзялення іх статусам прэмій, бонусаў і іншага) занялі каля 35 працэнтаў рынку, пры гэтым нядобрасумленна пацясняючы дзяржаўныя структуры, у тым ліку з дапамогай сеткавых структур».

Прэзідэнт падкрэсліў, што «дыктат сетак недапушчальны, ён ужо наблізіўся да непрымальнага значэння». Акрамя таго, кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на праблему нясвоечасовых разлікаў за лікёра-гарэлачныя вырабы.

«Як я ўжо сказаў, выцясняюцца дзяржпрадпрыемствы, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — З дзяржпрадпрыемстваў за рэалізацыю лікёра-гарэлачных вырабаў патрабуюць скідкі, часам да 40 працэнтаў кошту, і, як я гаварыў, устанаўліваюць незразумелыя бонусы і прэміі для гандлёвых сетак за кошт, зразумела, вытворцы».

Кіраўнік дзяржавы таксама сказаў, што кантрафактная прадукцыя з Расіі і іншых краін «задушыла краіну». «Хто перашкаджае ўраду абараніць уласны рынак?» — задаў слушнае пытанне Прэзідэнт. Ён таксама сказаў, што спецыялісты прапануюць увесці строгую адказнасць за пастаўкі ў Беларусь кантрафактнай прадукцыі аж да канфіскацыі транспартных сродкаў, на якіх яна пастаўляецца.

Прэзідэнт запатрабаваў, каб да 1 верасня ўсе запазычанасці па аплаце пастаўленай прадукцыі былі пагашаны. Кіраўнік дзяржавы даручыў кантраляваць гэта пытанне КДБ.

Прэзідэнт звярнуў асаблівую ўвагу на праблему нясвоечасовых разлікаў за лікёра-гарэлачныя вырабы. Ён строга паставіў пытанне — чаму наогул дапушчана такая сітуацыя, калі запазычанасць гандлёвых аб'ектаў перад вытворцамі часам перавышае сумы крэдытаў гэтых прадпрыемстваў.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў, каб у цэлым у краіне былі ўзмоцнены меры за неаплату пастаўленай прадукцыі аж да пазбаўлення ліцэнзій.

На нарадзе была закранута праблема складскіх запасаў прадукцыі і недапрацовак у яе прасоўванні на ўнутраны і замежны рынкі. Патрабаванне кіраўніка дзяржавы — да 15 верасня абсалютна ўся выраблена прадукцыя павінна быць пастаўлена ў гандлёвыя сеткі. «З сённяшняга дня павінен быць дыктат не гандлёвых сетак, а вытворцаў», — перакананы Аляксандр Лукашэнка.

Ён таксама закрануў тэму пасрэднікаў, у выніку выкарыстання паслуг якіх павышаюцца цэны на прадукцыю. Таму яшчэ адно патрабаванне Прэзідэнта — не павінна быць ніякіх пасрэднікаў у рэалізацыі прадукцыі.

■ Парламенцкі дзённік

УМОВЫ ДОСТУПУ

У верасні пройдзе другі Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі

Як будзе прадстаўлена на Форуме айчынная прадукцыя? Наколькі мы выкарыстоўваем патэнцыял беларуска-расійскага ўзаемадзеяння? Якія перашкоды і перспектывы ў ім хаваюцца? На гэтыя і іншыя пытанні адказаў Анатоль РУСЕЦКІ, намеснік старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, кіраўнік аргкамітэта форуму з беларускага боку, падчас інтэрв'ю Беларускаму тэлеграфнаму агенцтву.

— Ужо праз месяц пачне працу другі Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Сочы. Актыўная работа па яго арганізацыі вялася Саветам Рэспублікі ў цесным узаемадзеянні з Саветам Федэрацыі яшчэ з пачатку года, — паведаміў Анатоль Русецкі. Па яго словах, асноўнае мерапрыемства пройдзе ў фармаце пленарнага пасяджэння на тэму «Прамысловая палітыка Саюзнай дзяржавы: агульныя падыходы і рэгіянальныя аспекты». Акрамя таго, запланаваны тры тэматычныя секцыйныя пасяджэнні, якія таксама будуць прысвечаны асноўнай тэме форуму — прамысловай палітыцы. На яе зірнуць з трох ракурсаў: праз рэгіянальнае ўзаемадзеянне, праз праграмы Саюзнай дзяржавы і з пункту гледжання вопыту вядзення прамысловай палітыкі кожнай з краін.

Таксама плануецца арганізаваць выставу і кірмаш-продаж прамысловых і харчовых тавараў — пляцоўку для прэзентацыі нашага патэнцыялу.

— У першую чаргу, — кажа Анатоль Русецкі, — гаворка ідзе аб прадукцыі машынабудавання: БелАЗы, МАЗы, трактары МТЗ, тэхніка «Амкадора», камбайны «Гомсельмаша», прадукцыя «Бабруйскагрэгмаша», «Магілёўліфтмаша», Дзяржкамваенпрама і інш. Будзе прадстаўлена таксама бытавая тэхніка кампаній «Атлант» і «Гарызонт», прадукцыя дрэваапрацоўкі і нафтахімічнай галіны, арганізавана экспазіцыя навукова-тэхнічных дасягненняў.

На кірмашы-продажы сваю прадукцыю прадставяць прадпрыемствы з усіх абласцей Рэспублікі Беларусь і горада Мінска.

Сенатар закрануў і праблемнае пытанне таго, што перашкаджае далейшаму развіццю двухбаковага беларуска-расійскага супрацоўніцтва:

— У апошні час паўстаў шэраг фактараў, якія істотна ўплываюць на ўмовы доступу да рынку Расіі. Сур'ёзны ўплыў у тым ліку аказвае ўступленне Расіі, а цяпер і Казахстана, у Сусветную гандлёвую арганізацыю, увядзенне шэрагам краін санкцый у дачыненні да Расійскай Федэрацыі і прыняцце ёй мер у адказ па абароне свайго рынку.

Таму адна з галоўных задач, якую ставяць перад сабой беларускія арганізатары, — падпісанне новых пагадненняў і кантрактаў. Падчас форуму, дарэчы, плануецца падпісаць кантракты на суму больш за $100 млн. Больш за тое, стаіць задача не проста нарошчваць двухбаковы тавараабарот, а рэалізаваць сумесныя ўзаемавыгадныя праекты.

Сёння заключана каля 70 пагадненняў паміж Рэспублікай Беларусь і суб'ектамі Расійскай Федэрацыі. Вядучыя пазіцыі па ўзаемным гандлі з Беларуссю займаюць Цэнтральны, Уральскі, Прыволжскі і Паўночна-Заходні федэральныя акругі. Найбольш плённа ідзе ўзаемадзеянне з Масквой і Санкт-Пецярбургам, Цюменскай, Маскоўскай, Смаленскай, Арэнбургскай, Бранскай, Ніжагародскай, Калужскай абласцямі, Рэспублікай Татарстан. Аб'ём знешняга гандлю з гэтымі рэгіёнамі перавышае 70% беларуска-расійскага тавараабароту. У нашай краіне створана амаль 3000 арганізацый з расійскімі інвестыцыямі, устаўны капітал якіх складае каля $800 млн, у тым ліку больш за 1500 — у форме сумесных прадпрыемстваў. У Расіі працуе больш за 1000 арганізацый з беларускім капіталам. І, па словах Анатоля Русецкага, эфектыўная праца падчас форуму зможа зрабіць беларуска-расійскае ўзаемадзеянне яшчэ больш якасным.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

■

■ Фінансы

КУРС РУБЛЯ БУДЗЕ ЗАЛЕЖАЦЬ АД ЗМЯНЕННЯ ЗНЕШНІХ ФАКТАРАЎ

Што думаюць у Нацбанку пра бягучую сітуацыю на валютным рынку

Адпаведны каментарый упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязяў размешчаны на афіцыйным сайце Нацбанка, паведамляе БЕЛТА.

У пачатку года Нацыянальны банк Беларусі змяніў падыходы да правядзення курсавой палітыкі, перайшоўшы да выкарыстання гібкага механізма фарміравання абменнага курса беларускага рубля пры мінімальным удзеле Нацыянальнага банка ў біржавых таргах. Па сутнасці гэта рыначнае курсаўтварэнне, пры якім курс нацыянальнай валюты адносна долара ЗША і іншых замежных валют фарміруецца на аснове попыту і прапанавання на валютным рынку.

Адказваючы 4 жніўня на пытанні ў час прэс-канферэнцыі для прадстаўнікоў беларускіх і замежных сродкаў масавай інфармацыі, старшыня праўлення Нацыянальнага банка Павел КАЛАУР адзначыў адсутнасць унутраных фактараў, якія ўздзейнічалі б на курс беларускага рубля і істотна змянялі яго дынаміку. Пры гэтым кіраўнік Нацбанка асабліва падкрэсліў, што ва ўмовах механізма рыначнага курсаўтварэння, які прымяняецца ў Беларусі, далейшая дынаміка курса нацыянальнай валюты ў многім будзе залежаць ад змянення знешніх фактараў, перш за ўсё цаны на нафту і дынамікі курсаў валют у краінах — асноўных гандлёвых партнёрах Беларусі.

За мінулы перыяд на сусветных фінансавых рынках адбыліся сур'ёзныя змяненні, якія прывялі да істотнага павышэння валацільнасці шэрагу ключавых эканамічных паказчыкаў. Такія кан'юнктурныя фактары, як рэзкае зніжэнне сусветных цэн на нафту, значнае аслабленне курсаў расійскага рубля, кітайскага юаня і казахстанскага тэнге, у значнай ступені паўплывалі на ўнутраны валютны рынак краіны, узмацніўшы валацільнасць абменнага курса беларускага рубля да асобных валют.

Праводзімая Нацыянальным банкам гібкая курсавая палітыка дае магчымасць абменнаму курсу выступаць у якасці абсарбенту неспрыяльных знешніх фактараў, зніжаючы ступень знешнеэканамічных дысбалансаў. Пры гэтым ва ўмовах прымянення рэжыму кіруемага плавання бягучая дынаміка абменнага курса беларускага рубля, якая складваецца як рэакцыя на знешнія эканамічныя фактары, дае магчымасць падтрымліваць канкурэнтаздольнасць эканомікі і дзелавую актыўнасць, выступаць фактарам макраэканамічнай стабільнасці.

Уплыў знешніх кан'юнктурных фактараў можа прыводзіць да рознанакіраванага руху курса, узмацняючы тым самым яго валацільнасць. Па меры зніжэння турбулентнасці на знешніх рынках і аслаблення кан'юнктурных фактараў будзе зніжацца і валацільнасць абменнага курса беларускага рубля.

Дзеянні Нацыянальнага банка накіраваны на зніжэнне празмерных кан'юнктурных ваганняў курса, не перашкаджаючы дзеянню фундаментальных фактараў. Праводзімая строгая манетарная і бюджэтна-падатковая палітыка прызначана забяспечыць падтрымку абменнаму курсу і абмежавальны эфект на інфляцыю.

У бліжэйшай перспектыве намаганні Нацыянальнага банка будуць сканцэнтраваны на дасягненні цэнавай стабільнасці, прызначанай захаваць пакупную здольнасць беларускага рубля. Стабілізацыя інфляцыйных працэсаў забяспечыць устойлівасць эканомікі ў сярэднетэрміновай перспектыве і будзе садзейнічаць фарміраванню ўмоў для забеспячэння доўгатэрміновага эканамічнага росту.

■

■ Грошы

КРЭДЫТЫ НА КАРТКУ

Сёння шмат грамадзян турбуе пытанне аб тым, калі ж знізяцца стаўкі па крэдытах. Працэнтная стаўка шмат у чым залежыць ад кошту грашовых сродкаў, якія прыцягвае банк. У бягучай эканамічнай сітуацыі няма адназначнага адказу наконт таго, калі патаннеюць крэдыты, аднак, па словах намесніка дырэктара дэпартамента крэдытавання насельніцтва Беларусбанка Святланы ФІЛІПЧУК, сёлета банк неаднаразова памяншаў стаўкі па ўсіх відах спажывецкіх крэдытаў. Напрыклад, у ліпені яны былі зніжаны да 38-42%. Акрамя таго, з 3 жніўня адбылося зніжэнне да 32% гадавых стаўкі па крэдытных дагаворах на фінансаванне нерухомасці, а таксама па раней выдадзеных крэдытах на будаўніцтва, рэканструкцыю і набыццё жылля.

ГЭТА ВЫГАДНА

Цяпер пры афармленні спажывецкага крэдыту на картку Беларусбанкам прадугледжаны пэўныя выгады. Пры гэтым банк не спаганяе якіх-небудзь дадатковых плацяжоў па крэдытах кшталту камісіі за суправаджэнне, абаненцкай платы. Кліент выплачвае толькі асноўны доўг і працэнт.

«Аднак варта памятаць, што пры зняцці з крэдытнай карткі наяўных кліент выплачвае ўзнагароджанне, памер якога залежыць ад знятай сумы. Таму лепш аплачваць пакупкі безнаяўнымі, бо ў гэтым выпадку камісія не спаганяецца», — патлумачыла прадстаўнік Беларусбанка.

Сёння крэдытную картку на спажывецкія патрэбы могуць аформіць і пенсіянеры нават з улікам таго, што яны жывуць толькі на адну пенсію.

«Такім кліентам банк прапануе спецыяльны крэдытны прадукт «Час жыць» па зніжаных стаўках. Крэдыт прадастаўляецца з выкарыстаннем крэдытнай карткі ў памеры да 150 базавых велічынь (цяпер 27 млн рублёў) тэрмінам да 3 гадоў. Прычым у першы год працэнтная стаўка па крэдыце зніжана на 2 працэнтныя пункты», — патлумачыла намеснік дырэктара.

НА СПАЖЫВЕЦКІЯ ПАТРЭБЫ

Крэдыты на спажывецкія патрэбы становяцца ўсё больш запатрабаванымі. У крэдыт можна ўзяць і беларускую бытавую тэхніку. Напрыклад, для набыцця бытавой тэхнікі «Атлант» ёсць асобны крэдыт па зніжанай працэнтнай стаўцы, без паручыцеляў, на тэрмін да 1 года.

З ВАЛЮТЫ Ў РУБЛІ

Сёння Беларусбанк прадастаўляе крэдытаатрымальнікам магчымасць перавесці ў беларускія рублі запазычанасць па крэдытах у замежнай валюце. Перавод запазычанасці ажыццяўляецца па курсе продажу замежнай валюты, які выкарыстоўваецца пры здзяйсненні аперацый з аплатнымі карткамі Беларусбанка.

Перавод запазычанасці ў беларускія рублі дазволіць пазбегнуць валютных рызык у далейшым.

Ілья КРЫЖЭВІЧ
kryzhevich@zviazda.by

■ Блізкая ўлада

ГРАМАДСКІЯ ІНТАРЭСЫ — ВЫШЭЙ ЗА АСАБІСТЫЯ

ПРА ГЭТА СВЕДЧАЦЬ ЗВАРОТЫ ГРАМАДЗЯН НА «ПРАМЫЯ ТЭЛЕФОННЫЯ ЛІНІІ»

Больш як 30 званкоў паступіла на «прамую лінію», што правёў намеснік старшыні Мінаблвыканкама Віктар СІРЭНКА. Як правіла, усе заяўнікі адразу, нават не прадставіўшыся як след, вельмі эмацыйна пачыналі аповед пра свае цяжкасці, прасілі дапамогі, кансультацыі. Віктар Іванавіч іх перапыняў, цярпліва ўдакладняў прозвішча, адрас, прасіў больш дакладна сфармуляваць сутнасць праблемы. Колькі людзей, якім патрэбна дапамога, праз гэта не маглі дазваніцца», — з жалем канстатаваў ён.

Віктар Сірэнка правёў з пачатку года не адну «прамую тэлефонную лінію», таму ўпэўнена сцвярджае, што ў працэнтных суадносінах за гэты час тэматыка зваротаў грамадзян практычна не памянялася. Асноўныя — асфальтаванне і рамонт дарог, водазабеспячэнне, прыватызацыя жылля, правільнасць налічэння пенсій, камунальна-бытавыя паслугі. Часам людзі звяртаюцца паўторна. І ў гэтым, на яго думку, вінавата мясцовае кіраўніцтва, якое фармальна падышло да даручэння Мінаблвыканкама, не разабралася належным чынам у сітуацыі.

У прыватнасці, Пётр Аніськоў з вёскі Гусгалаўка Мінскага раёна патэлефанаваў на «прамую лінію» ў другі раз. Праз населены пункт праходзіць дарога, якая злучае дзве трасы — М1 і М4. Гэты ўчастак шляху трэба было б заасфальтаваць, паколькі ім карыстаецца Мінская агароднінная фабрыка. На першы запыт заяўніку адказалі, што сёлета планам асфальтаванне не прадугледжана. «Дайце адказ, у якім годзе яго ўключаць у план», — прасіў мужчына. Віктар Сірэнка паабяцаў, што яму пра гэта афіцыйна паведамяць.

— Людзі павінны быць інфармаваны па асноўных пытаннях: чарговасці і ходзе будаўніцтва водаправода, асфальтавання дарог у населеных пунктах, рамонту дамоў, газіфікацыі. Планы павінны быць адкрытымі і даступнымі для ўсіх, а іх рэалізацыя мясцовымі ўладамі павінна быць на кантролі насельніцтва, — лічыць Віктар Сірэнка.

Падчас тэлефанаванняў людзі, як правіла, падымалі сацыяльна значныя пытанні, што тычацца матэрыяльнага дабрабыту, павышэння ўзроўню жыцця ўсіх жыхароў населенага пункта.

Напрыклад, Віктар Бакуноў з Заслаўя адразу папярэдзіў, што ён клапоціцца найперш аб грамадскіх інтарэсах. Мужчына прасіў дапамогі ў вырашэнні цэлага комплексу праблем: аховы здароўя, добраўпарадкавання, забеспячэння чыстай вадой, арганізацыі маршрутнага таксі да Бараўлян. Акрамя таго, як сказаў заяўнік, жыхароў хвалюе, што ў Заслаўі закрылі пашпартны стол. І цяпер па любую драбязу, у прыватнасці памяняць пашпарт ці паставіць у ім штамп, даводзіцца ехаць у Мінск, марнаваць час. Цікавіўся ён і будаўніцтвам новай паліклінікі. Віктар Сірэнка адказаў, што будаўніцтва такой медыцынскай установы ў горадзе не плануецца. Затое дзеючая будзе пашырана: сёлета пачнецца ўзвядзенне прыбудовы да яе. На астатнія пытанні заяўнік атрымае адказ адпаведных службаў, куды будуць накіраваны запыты.

Юлія Сяргееўна жыве ў адной з вёсак Столінскага раёна, што на Брэстчыне. Звярнуцца на «прамую лінію» яе прымусіла крыўда на кіраўніцтва прыватнай сельгаскампаніі, што знаходзіцца ў Стаўбцоўскім раёне Мінскай вобласці. Як паведаміла жанчына, яна і яшчэ пяць яе землякоў цэлы месяц палолі цыбулю на палях гэтай фірмы. З імі быў заключаны дагавор. Па заканчэнні тэрміну яго дзеяння ім не далі на подпіс акт выкананых работ, не разлічыліся: абяцалі выслаць дакумент, як і грошы, па адрасе пражывання. Але замест гэтага работнікі атрымалі па пошце... незапоўнены бланк акта на подпіс. Тэлефанавалі, каб ім вярнулі зароблена, але там не здымаюць трубку.

Віктар Іванавіч параіў Юліі Сяргееўне звярнуцца ў пракуратуру з афіцыйнай заявай. Калі няма часу прыехаць у райцэнтр, то можна даслаць ліст па электроннай пошце або заказным пісьмом. Акрамя таго, кіраўніцтву Стаўбцоўскага раёна будзе накіравана пісьмо з даручэннем разабрацца ў сітуацыі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ



Паводле даных Мінсельгасхарча, уборачная кампанія набліжаецца да завяршэння — у рэспубліцы ўбрана ўжо каля 97 працэнтаў плошчаў. Усяго 0,5 тыс. га трэба ўбраць гаспадаркам Брэсцкай вобласці, не ўбралі яшчэ 1,1 тыс. га ў Гомельскай вобласці, 1,7 тыс. га — у Магілёўскай, 9,8 тыс. га — у Гродзенскай, 12,3 тыс. га — у Мінскай, 47,8 тыс. т — у Віцебскай вобласці. Усяго ў гэтым годзе пад збожжавыя і зернебабовыя адведзена 2 млн 184,6 тыс. га. У сярэднім з 1 га аграрыі ўбіраюць 39,2 ц збожжа — усяго на 0,1 ц менш, чым у 2014 годзе.

НА СУВЯЗІ

22 жніўня, у суботу, начальнік Дэпартамента аховы МУС Беларусі генерал-маёр міліцыі Сяргей Мікалаевіч ХАМЕНКА правядзе прамую тэлефонную лінію. Пытанні, якія тычацца прадастаўляемых дэпартаментам паслуг, іх коштаў, патрабаванняў да кандыдатаў на службу, а таксама іншыя пра дзейнасць службы аховы можна будзе задаць **з 9.00 да 12.00 па тэлефоне: (8-017) 218-55-30.**

■ Не прапусціце!

ПАЛЯТАЕМ?

Тым, хто не ўяўляе сваё жыццё без рамантыкі, прыгод і неба, абавязкова трэба прыйсці ў гэтую суботу на аэрадром Нова-Пашкова, што пад Магілёвам.

Авіяцыйна-спартыўнае свята пачнецца а 10-й гадзіне. У праграме — дэманстрацыйныя палёты авіяцыйнай тэхнікі ваенна-паветраных сілаў і войскаў супрацьпаветранай абароны Узброеных Сіл Беларусі, групавыя пілатажы лётчыкаў, скачкі з парашутам з элементамі акрабатыкі ваеннаслужачых і спартсменаў, паказныя заняткі па рукапашным баі спецназаўцаў. Дзецям будзе цікава пабачыць выставу спартыўнай тэхнікі. А дарослым здзейсніць аглядныя палёты на самалёце АН-2, верталёце Мі-2, а таксама пастраляць з пнеўматычнай зброі.

Магілёўскі аэраклуб імя А.М. Кулагіна, які такім чынам святкуе сваё 80-годдзе, мае даўнія традыцыі і важкія заслугі перад Радзімай. За гады сваёй дзейнасці ён падрыхтаваў тысячы разраднікаў па авіяцыйных відах спорту, 64 майстроў парашутнага, самалётнага і авіямадэльнага спорту, двух майстроў спорту міжнароднага класа, заслужанага майстра спорту. Сярод тых, хто мужна змагаўся ў небе ў гады Вялікай Айчыннай вайны, чацвёра Герояў Савецкага Саюза. Гэта былыя выхаванцы магілёўскага аэраклуба Андрэй Кулагін (імя якога носіць аэраклуб), Міхаіл Лусто, Ціхан Жучкоў, Георгій Надтачэеў. Ужо пасля вайны ганаровае званне Героя Савецкага Саюза пасмяротна атрымаў Андрэй Мельнікаў, які загінуў падчас выканання інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане. Яшчэ адзін выхаванец аэраклуба Ігар Уразаеў стаў Героем Расіі за праяўленую мужнасць і прафесійнае вядзенне бою падчас баявых дзеянняў у Чачні.

Нэлі ЗІГУЛЯ

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

ТУНІС АДМЯНІЎ ВІЗЫ ДЛЯ ГРАМАДЗЯН НАШАЙ КРАІНЫ

Урад Туніса прыняў рашэнне аб адмене ўязных віз для грамадзян Беларусі. Гэтую інфармацыю, раней распаўсюджаную турыстычнымі агенцтвамі, пацвердзіў прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Дзмітрый МІРОНЧЫК.

— Знаходжанне на тэрыторыі Туніса не павінна перавышаць 90 сутак, — паведаміў прадстаўнік МЗС. — Для ўезду грамадзяне нашай краіны павінны мець пашпарты і праязныя дакументы.

Ён таксама прызнаўся, што наша знешнепалітычнае ведамства вітае дадзенае рашэнне туніскага боку.

— Адначасова неабходна звярнуць увагу на тое, што ў Тунісе яшчэ не адменены рэжым надзвычайнага становішча, уведзены пасля двух рэзанансных тэрактаў, — папярэдзіў Дзмітрый Мірончык. — Туніскія ўлады і ваенныя прымаюць меры па забеспячэнні бяспекі замежных турыстаў у курортных зонах. Тэрарыстычная пагроза ў краіне захоўваецца, 100-працэнтнай гарантыі бяспекі замежных грамадзян няма.

Нагадаем, 30 чэрвеня ў сувязі з тэрактам у Тунісе МЗС рэкамендавала беларускім грамадзянам, якія знаходзяцца ў гэтай краіне, выконваць максімальна магчымыя меры засцярогі і ўстрымацца ад наведвання месцаў масавага збору людзей. Гэтыя рэкамендацыі застаюцца ў сіле.

Надзея ЮШКЕВІЧ.

ПЕРАХОДЫ БУДУЦЬ ПАД ПІЛЬНАЙ УВАГАЙ

Напярэдадні навучальнага года сталічная Дзяржаўтаінспекцыя ўзмацніла кантроль за захаваннем кіроўцамі правіл праезду пешаходных пераходаў. Мерапрыемствы будуць доўжыцца да 26 жніўня.

— У гэты перыяд увесь асабовы склад дарожнай міліцыі будзе патруляваць напружаныя ўчасткі дарог: нарады ДПС набліжаны да аварыйна-небяспечных пешаходных пераходаў, — гаворыць **старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Партызанскага РУУС г. Мінска Таццяна СПАДАБАЕВА.** — Інспектары ДАІ выправяцца ў працоўныя калектывы прадпрыемстваў і аўтагаспадарак горада, вучэбныя ўстановы і аўташколы, каб нагадаць усім удзельнікам дарожнага руху правілы бяспечных паводзін пры пераходзе праезнай часткі і праездзе пешаходных пераходаў.

За парушэнне правілаў праезду апошніх прадугледжана адказнасць у выглядзе штрафу ў памеры да пяці базавых велічынь. У выпадку паўторнага падобнага парушэння цягам года штраф павялічваецца да васьмі базавых велічынь.

Сяргей РАСОЛЬКА.

БЕНЕДЫКТ XVI АХВЯРАВАЎ НА ДАБРАЧЫННАСЦЬ СВАЕ ЧАРАВІКІ

У Германіі сёлета адзначаецца 150-я гадавіна з дня смерці вядомага нямецкага святара, рэлігійнага дзеяча, шаўца Адольфа Кольпінга, і адрасатам славутых пантофляў папы на пенсіі стаў дабрачынны фонд "Кольпінгверк". Дар папы мусіць распачаць кампанію "Мой абутак робіць дабро!". У яе межах жыхары Кёльна спрабуюць сабраць 15 тысяч пар абутку.

Якаў ЖУРБІН.

ЗААПАРК, ДЗЕ МОЖНА ПАГЛАДЗІЦЬ ЗВЕРА

Першы ў сталіцы кантактны заапарк, у якім жывёл можна будзе гладзіць, карміць і расчэсваць, абяцаюць адкрыць 22 жніўня ў гандлёва-забаўляльным цэнтры «Тытан» падчас Фестывалю ўсёзнайкі.

Кантактны заапарк сеткі «Краіна Яноція» зойме плошчу каля 300 квадратных метраў. У ім будуць прадстаўлены дзясяткі відаў звяроў і птушак, у тым ліку поні, камерунская каза і аленяня. У якасці «фірменнай» жывёлы абраны яноты — насухі і паласкуны. У заапарку будзе працаваць аніматар, а развіваць у дзіцяці таленты прапануюць ў зоне дзіцячай творчасці. Для маленькіх наведвальнікаў арганізуюць майстар-класы, падчас якіх навучаць у тым ліку плесці бранзалеты, рабіць дробныя вырабы і правільна маляваць звяроў. У дзень адкрыцця трапіць у кантактны заапарк можна будзе за паўцаны.

На Фестывалі ўсёзнайкі, які прымеркаваны да Дня ведаў, будзе працаваць імправізаваная школа. Вядучы ў ролі вясёлага настаўніка правядзе ўрокі геаграфіі, біялогіі, выяўленчага мастацтва і фізкультуры. Напрыклад, будучым біёлагам прапануюць перадаць голасам гукі розных жывёл, а на ўроку музыкі трэба будзе

ўгадаць мелодыю. Таксама чакаюцца кулінарнае шоу і выступленне юных артыстаў. Апроч гэтага, у гандлёвым цэнтры пройдзе распродаж дзіцячых тавараў. Зніжкі на цацкі, адзенне і школьныя прыналежнасці абяцаюць да 50 працэнтаў. Уваход на фестываль вольны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

СМОГ НАД БРЭСТАМ

Яшчэ ў сераду раніцай Брэст прачнуўся ў лёгкім смогу. У чацвер едкі пах адчуўся над горадам яшчэ больш. Як патлумачыў спецыяліст абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Юрый КАЛЯДА, ужо два тыдні на тэрыторыі Украіны, фактычна на мяжы з Маларыцкім раёнам, гараць тарфянікі. 18 жніўня напрамак ветру перамяніўся, падзьмула ў наш бок. Вось непрыемны пах і дайшоў да Брэста.

Як паведамілі ў абласным цэнтры гігіены, эпідэміялогіі і аховы грамадскага здароўя, вядзецца маніторынг паветра на тэрыторыі населеных пунктаў на ўтрыманне прадуктаў гарэння: аксіду вугляроду, вокісу азоту і іншых. Пакуль што перавышэння дапусцімых канцэнтрацый указаных рэчываў не выяўлена. Але ж дыхаць ў Брэсце становіцца ўсё цяжэй.

Яшчэ горш даводзіцца жыхарам Маларыты і памежных вёсак. **Рэдактар маларыцкай раённай газеты «Голас часу» Ніна СВІЦЮК** сказала, што ў райцэнтры ўжо наогул вокны адкрыць нельга. І калі днём ветрык крыху разганяе смурод, то ноччу пах торфу, які гарыць, асабліва дакучае. Застаецца спадзявацца толькі на дажджы, якіх сіноптыкі пакуль, на жаль, не абяцаюць.

Святлана ЯСКЕВІЧ. *yackevich@zviazda.by*

ПЯЦЬ ЗЯЛЁНЫХ МАКАРОН...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Калі мае выхаванцы дрэнна сябе паводзяць і не слухаюцца, яны ў мяне працуюць папялушкамі, — смяецца Васіліна. *— Я ссыпаю ў таз рознакаляровыя крупы і прашу дзяцей выбраць, напрыклад, толькі жоўтыя рысінкі або сіні панцак. Пакуль яны заняты, у мяне настрой вяртаецца, і дзеці атрымліваюць нейкую ўзнагароду — налепку, малюнак. Дарэчы, з дапамогай такіх рэчаў мы вучымся лічыць: я прашу пакласці ў талерку пяць зялёных макарон або восем белых фасолін.*

Калі дзеці задаюць нейкае пытанне, я часткова адказваю на яго, а потым дадаю, што больш грунтоўна ім пра гэта раскажа настаўнік у школе, які ведае больш за мяне і растлумачыць цікавей.

Важна навучыць малых кантактаваць з аднагодкамі і дарослымі. Васіліна рэкамендуе бацькам, проста гуляючы на дзіцячай пляцоўцы, заахвочваць сваё дзіця да сумесных гульняў з іншымі, дапамагаць яму знаёміцца.

Ніколі не думала, як гэта працуе, пакуль аднойчы з 4-гадовым сынам і мячом не пайшла на пляцоўку, дзе мы сталі кідаць яго праз адтуліны ў сценцы для лазання. Спачатку да нас далучылася 6-гадовая Таня, пасля — 1,5-гадовы Мацей, праз нейкі час зацікавіліся і некалькі падлеткаў 8-11 гадоў. Гулялі на балы, якія налічваліся, калі мяч праскоквае праз адтуліну. Я была суддзёю. Не перадаць, які азарт быў у 10-годак, калі яны бачылі, што мой Ягор пракінуў мячык, а ў іх не атрымалася. Праз колькі дзён мы зноў сустрэлі Таню, якая перамагла ў першым спаборніцтве. Даведаўшыся, што на гэты раз мы без мяча, яна збегала па свой, і дваравая спартакіяда зноў адбылася. Магу сказаць дакладна адно: не бойцеся наладжваць стасункі з незнаёмымі — бачачы гэта, ваша дзіця будзе крыху смялейшым.

СЫН ЧЫТАЕ Ў 4 ГАДЫ! ШТО РАБІЦЬ?!

Галоўная праблема не ў тым, у шэсць, сем ці пяць гадоў аддаваць дзіця ў школу і што яно пры гэтым умее, а як сябе адчувае. Асабіста мяне, напрыклад, не ўзялі ў школу, калі мне хацелася, бо на 1 верасня мне не хапала да шасці двух месяцаў, хаця я ўжо з чатырох гадоў чытала кнігі, а з пяці — газеты. Налета, калі я ўжо адвучылася дзве чвэрці, настаўнікі схапіліся за галаву: «Ёй жа тут нецікава! Давайце пераводзіць у другі клас, каб не пакутавала!» Аднак маці не дазволіла тузаць мяне пасярод навучальнага года. А ці мала такіх прыкладаў...

У старэйшых групах дзіцячага сада ствараюцца ўмовы, падобныя да школьных. Гэта заняткі па 25-30 хвілін, калі дзеці вучацца матэматыцы, пісьму, роднай мове, адказваюць на пытанні і выконваюць заданні. Выхавацель рэкамендуе замацоўваць здабытыя веды і дома і заклікае бацькоў правільна вымаўляць словы, бо іх слоўнікавы запас пяройдзе да дзіцяці.

— Мы не павінны вучыць дзяцей чытаць, але ва ўзросце 5-6 гадоў у большасці ўжо фізіялагічна абумоўлены і сфарміраваны задаткі для чытання, — дзеліцца Васіліна Жарнак. *— Аднойчы да мяне падышоў 4-гадовы Міця і кажа: «Васіліна Антонаўна, а я ведаю, што тут напісана. Прачытаць?» Тут жа вымавіў мне літары, склаў іх у назву казкі і далей працягвае. А ўвечары прыйшла яго маці і спытала, што рабіць. Адказ просты: калі яму гэта падабаецца — няхай чытае. Гэта развівае памяць, мысленне, фантазію. Калі я сама пайшла ў першы клас, у нас чытала 3-4 чалавекі. Зараз жа бацькі маіх дзетак, у каго ёсць старэйшыя, кажуць, што ім даводзіцца чуць ад настаўнікаў наступныя фразы: «Не ўмее чытаць? Ну, ведаеце, такіх у нас няшмат, будзем, вядома, нешта рабіць...» Я не хачу сказаць, што дзіця павінна ўмець чытаць, а толькі давесці, што не трэба яму перашкаджаць рабіць гэта.*

Што рабіць разам з дзіцем

Калі ідзяце па вуліцы, раскажыце, чаму лісты на дрэвах летам зялёныя, а ўвосень каляровыя, чаму некаторыя птушкі адлятаюць ад нас зімою, чаму едзе транспарт, чаму людзі апранаюцца... А потым самі пытайцеся пра гэта і іншае ў сына ці дачкі, хай яны спрабуюць тлумачыць і адказваць на пытанне «Чаму?».

Запускайце паветранага змея, лавіце матылькоў, гойсайце на роліках ды ровары.

Сапраўдная скарбніца — сэнсарная скрынка, у якую ўпотай ад малога можна скласці рознакаляровыя каменьчыкі, абгорнутыя фольгай: тут вам і працэс пошуку, і захапленне ад разгортвання, а на выхадзе — праца маторыкі і развіццё мозга.

Смела цягніце ў дом шышкі, каштаны, каменьчыкі, галінкі... Для дзіцяці гэта спачатку скарбы, а пасля — матэрыял для вашых сумесных вырабаў.

Самае крыўднае — калі ў малых высвятляюць, што яны сёння елі і пілі, а не пра што даведаліся.

Бацькі, якія збіраюцца аддаць сваё малое адразу ў гімназію, павінны разумець, на што ідуць. У большасці такіх прывілеяваных устаноў дашкольнік павінен здаць своеасаблівы іспыт: расказаць, як яго завуць, і назваць адрас, палічыць ад аднаго да дзесяці і, наадварот, расказаць верш... І працуюць у гімназіях, арыентуючыся на тых, хто можа больш.

— Тым, хто збіраецца ў гімназію з першага класа, я раю абавязкова пахадзіць на заняткі ў прыватныя развіваючыя цэнтры, дзе праграма падрыхтоўкі да школы больш паглыбленая, а дадому даюць заданні для замацавання пройдзенага. Гэта карысна для дзяцей яшчэ і тым, што малыя лепш засвойваюць веды ў дзіцячым садку, — сведчыць выхавацель. *— Мы не даём хатніх заданняў, але заўжды просім бацькоў займацца з дзецьмі дома, паўтараць, што вывучалі ў групе. Самае крыўднае — калі ў малых высвятляюць, што яны сёння елі і пілі, а не пра што даведаліся.*

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

Якія цацкі лепш набыць?

Хлопчыкам — канструктар, мазаіку і пазлы, а дзяўчынкам — набор цырульніка з лялькай ці набор для пляцення з рызінак. Падобныя цацкі стымулююць дробную маторыку і мысленне, што ў далейшым істотна дапаможа ў развіцці і пры пісьме. Карысныя серыі дзіцячых энцыклапедый, скакалка, абруч, мячы для сухога басейна, кеглі.

■ Насустрач 1-му верасня

ШКОЛЬНЫ КАНТЫНГЕНТ ПРЫРАСТАЕ

...у Мінску адкрыюцца больш як 900 першых класаў

Эксперымент па размяшчэнні старшых груп дзіцячых садкоў на базе мінскіх школ стартуе ў верасні ў Першамайскім раёне сталіцы. Пра гэта паведаміла журналістам начальнік аддзела дашкольнай, агульнай сярэдняй і спецыяльнай адукацыі Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Марына ЮРКЕВІЧ.

У новым навучальным годзе дзяцей-шасцігодак прымуць чатыры ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі — 20-я, 163-я, 177-я і 191-я школы. З аднаго боку, гэты крок дапаможа разгрузіць дзіцячыя садкі, а з іншага — спросціць адаптацыю малечы да школы. Умовы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі будуць максімальна набліжаны да тых, што ствараюцца для дзетак у садках: з абсталяваннем памяшканняў для групавых заняткаў, асобнымі пакоямі для гульняў і сну.

Акрамя таго, у бягучым навучальным годзе ў сталіцы запрацуе яшчэ адзін спецыяльны маршрут для падвозу дзяцей у дашкольныя ўстановы з мікрараёна «Лошыца» ў «Серабранку». На дадзены момант у горадзе дзейнічаюць пяць спецыяльных транспартных маршрутаў — тры ў Фрунзенскім, па адным — у Першамайскім і Ленінскім раёнах. Зараз у сталіцы налічваецца 441 дзяржаўны і восем прыватных садкоў, якія наведваюць больш як 93 тысячы выхаванцаў. Для павелічэння колькасці месцаў у дашкольных установах актыўна выкарыстоўваюцца ўнутраныя рэзервы. Найбольш дзейсны механізм — паэтапны вывад першых класаў з дзіцячых садкоў ва ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі. За апошнія чатыры гады іх выведзена 170. Да пачатку 2015/2016 навучальнага года будзе выведзена яшчэ 28 першых класаў.

— Усе праблемы з дэфіцытам месцаў у дашкольных установах паступова вырашаюцца, — запэўніла журналістаў Марына Юркевіч. — І ў нас яшчэ ні адна матуля не засталася ў дэкрэтным адпачынку з той прычыны, што яе дзіцяці не прадаставілі месца ў дзіцячым садку. Усе дзеці, якія маюць патрэбу, забяспечваюцца месцамі ў дашкольных установах. Няхай і не ў крокавай даступнасці, але ў горадзе наладжана добрае транспартнае забеспячэнне... А вось праблема з кадравым дэфіцытам у дашкольных установах пакуль захоўваецца. Калі раскідаць вакансіі на ўсе дашкольныя ўстановы, то ў сярэднім у кожнай з іх акажацца незапоўненай адна вакансія выхавальніка. Гэтая праблема будзе вырашацца за кошт прыцягнення студэнтаў пятага курса Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта і педагагічных работнікаў пенсійнага ўзросту. Да таго ж работнікам дзіцячых садкоў, якія не маюць профільнай адукацыі, даецца магчымасць прайсці адпаведную перападрыхтоўку.

З 1 верасня ў Мінску пачне працаваць новая школа №32 у мікрараёне «Лебядзіны» на 1020 навучэнцаў. Дарэчы, зараз у Мінску будуюцца яшчэ 4 школы (у «Каменнай Горцы», «Брылевічах», «Дамброўцы», «Лебядзіным») і 7 дзіцячых садкоў. У 4-м квартале гэтага года ў мікрараёне «Лебядзіны» будзе ўведзена ў эксплуатацыю ўстанова дашкольнай адукацыі, разлічаная на 190 месцаў.

Колькасць школьнікаў у новым навучальным годзе павялічыцца ў сталіцы прыблізна на 3 тысячы чалавек, пераважна за кошт першакласнікаў. У мінскіх школах адкрыюцца больш як 900 першых класаў, куды прыйдуць каля 23,4 тысячы вучняў.

Усяго ў школах і гімназіях горада будуць адкрыты 394 дзясятыя класы, з іх 206 профільных (у тым ліку і педагагічныя). Есць школы, дзе паралельна будуць дзейнічаць і профільныя, і базавыя класы. У профільных класах і пры арганізацыі ў школе мультыпрофільнага навучання дзесяцікласнікі змогуць выбраць 2-3 прадметы, якія яны будуць вывучаць на павышаным узроўні. Для таго каб быць залічанымі ў профільны клас, выпускнікі базавай школы праходзілі конкурсны адбор. Па профільных прадметах адзнака ў атэстаце павінна была быць не менш як 7 балаў, а сярэдні бал атэстата — не ніжэйшы за 6 балаў. Тыя, хто не ўпісаўся ў гэтыя патрабаванні, былі вымушаны выбраць або базавы клас, або ўвогуле перайсці ў суседнюю школу, дзе захаваліся базавыя класы.

Па словах Марыны Юркевіч, у гэтым годзе 71% выпускнікоў мінскіх школ працягнулі навучанне ў вышэйшых навучальных установах. Сярод выпускнікоў сталічных устаноў адукацыі — 84 «стабальніка». Найвышэйшую адзнаку — 100 балаў — атрымалі 29 выпускнікоў Ліцэя БДУ! А балы ад 90 да 100 набралі на цэнтралізаваным тэсціраванні 614 абітурыентаў, якія скончылі ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі ў сталіцы.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

Намеснік старшыні Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Віталь Аляксандравіч ПРЫГОДЗІЧ *праводзіць 22 жніўня «прамую» тэлефонную лінію і асабісты прыём грамадзян* ***з 9.00 да 12.00.*** *Задаць пытанні і выказаць прапановы можна па тэлефоне:* ***380 31 52.***

■ Будзь у курсе!

НАБЫЦЬ РАБОЧУЮ ПРАФЕСІЮ ЯШЧЭ НЕ ПОЗНА

20 жніўня завяршаецца афіцыйна адведзены тэрмін прыёму дакументаў ва ўстановы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. За дзень да заканчэння набору ў сталічных установах прафтэхадукацыі былі запоўнены 91,4% месцаў.

Як расказала **начальнік сектара прафесійна-тэхнічнай адукацыі Камітэта па адукацыі Мінгарвыканкама Алена ЧАРНЫХ,** традыцыйна не карыстаюцца папулярнасцю ў абітурыентаў такія прафесіі, як швачка, кравец, закройшчык і некаторыя спецыяльнасці будаўнічага профілю (муляр, бетоншчык, арматуршчык). Таму некаторым установам прафтэхадукацыі прадастаўлена права падоўжыць прыём дакументаў да 15 верасня.

Абітурыентаў чакаюць яшчэ амаль месяц у каледжы швейнай вытворчасці, у будаўнічых ліцэях №7 і №12, ліцэі №9 аўтамабілебудавання, у каледжы будаўніцтва і камунальнай гаспадаркі, прафесійна-тэхнічным каледжы лёгкай прамысловасці і комплекснай лагістыкі.

А вось такія рабочыя спецыяльнасці, як слесар па рамонце аўтамабіляў, цырульнік-візажыст, майстар па манікюры і педыкюры, памочнік машыніста электравоза, электраманцёр па рамонце і абслугоўванні электрааб-сталявання, муляр-тынкоўшчык і плітачнік-абліцоўшчык, ва ўстановах прафтэхадукацыі сталіцы цалкам укамплектаваны.

На ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі самы высокі конкурс быў зафіксаваны ў Мінскім дзяржаўным каледжы электронікі на спецыяльнасці «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» — 2,5-3 чалавекі на месца. Таксама па гэтым профілі склаўся конкурс і на платнай форме навучання.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV@R

«ХАЧУ РАБІЦЬ ЭМАЦЫЙНЫЯ ІНТЭРВ'Ю»

Напярэдадні адпачынку вядучы АНТ вядомы шоумен Яўген БУЛКА ў інтэрв'ю «Звяздзе» распавёў легенду пра залатыя пяскі, узгадаў, як пачынаў тэлекар'еру ў касцюме бусляняці і падзяліўся сваім самым свежым адкрыццём з эфіру праграмы «Наша раніца».

Фота Надзеі БУЖАН.

«Усіх прымусілі загаварыць пра хлопца, якога называлі «Хітошам»

— Яўген, дзе вы вырашылі правесці адпачынак?

— У Грэцыі, у рэгіёне Халкідыкі. Раней з жонкай мы любілі актыўна адпачываць, ездзіць, нешта глядзець, а цяпер, калі ў нас нарадзілася дзіця, нам патрэбны сямейны адпачынак з макімальным камфортам, вітамінамі, рэлаксам. Напярадзе вялікія праекты. І зараз трэба набрацца сіл, каб пасля ў іх пагрузіцца.

— А ці памятаеце, як адпачывалі летам у дзяцінстве?

— Я мог па некалькі змен праводзіць у лагеры «Арляня», што непадалёк ад майго Бабруйска. Жалезабетонныя фігуры, драўляныя жылыя карпусы, прыбіральня за 500 метраў ад жытла — усё гэта складала адпаведны антураж. Аднак гэта быў час шалёнага, рамантычнага, творчага праяўлення і пастаяннага ўдасканальвання камунікатыўных навыкаў. Добрая школа жыцця. Найлепшымі гульнямі былі тыя, якія мы прыдумвалі самі. За тэрыторыяй лагера знаходзіўся схіл да берага ракі. Было відавочна, што людзі з яго бралі пясок. А ён там такі драбнюткі, такі прыгожы... Карацей, мы прыдумалі, што гэта залатыя пяскі, якія абавязкова павінны быць пракляты. І калі ўсе знаходзіліся на дыскатэцы альбо на спартыўных спаборніцтвах, заўжды хацелася зганяць за тэрыторыю і назбіраць залатога пяску.

— А пад што танцавалі на дыскатэках?

— Як толькі пачыналася песня «Кока Джамба», адразу кідаўся ў пляс. Патанчыць пад гэтую песню было святой справай! Ну і, безумоўна, пад «It's my life» Доктара Албарна. А з геаграфічна набліжанага падабаўся гурт «Кар Мен».

— Цікава, што мае першыя ўспаміны пра вас звязаны таксама з песнямі. Гэта быў дзіцячы конкурс «Сузор'е надзей», які вы вялі ў касцюме нейкага звера...

— Я там заўжды быў у дзіўных касцюмах. Гэта шыкоўны піяр. Бо літаральна ўсіх прымусілі загаварыць аб нейкім хлопцы ў апрананні бусляняці. Мяне называлі «Хітошам». Мне тады было каля 20 гадоў. Кастынг не праводзілі. Гэта была выпадковая прапанова, якой я і скарыстаўся. Маёй напарніцай стала Воля Сацюк, дзяўчынка, якая адкрыла для Беларусі дзіцячае Еўрабачанне. У яе была мянушка «Шансі». Атрымліваецца, што яна дае шанц, а «Хітоша» ператварае песню ў хіт. Падобны праект быў шасцігадзінным выпрабаваннем песнямі і танцамі. Аўдыторыя — дзеці, іх бацькі. Але я адчуваў сябе патрэбным, важным, аўтарытэтным чалавекам.

— Можна толькі здагадвацца, колькі фотакартак з вашай выявай знаходзіцца ў альбомах былых удзельнікаў «Сузор'я надзей»...

— Спачатку шасцігадзінны канцэрт, а пасля такая ж фотасесія *(смяецца)*. Некаторыя з былых удзельнікаў праекта, дарэчы, сталі даволі вядомымі артыстамі. Я абвяшчаў выхад на сцэну Егіязара Фарашана, будучага ўдзельніка Еўрабачання ў гурце «3+2», Максіма Сапацькова, які пасля стаў Максам Лорэнсам, Б'янкі...

— На журфаку БДУ вы вучыліся па спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя», а ў выніку аказаліся на тэлебачанні.

— Калі ў старэйшых класах прыязджаў у Мінск і наведваў БДУ, разумеў, што буду вучыцца тут. Праўда, заглядваў я ў галоўны корпус і нават не ведаў, дзе знаходзіцца факультэт журналістыкі. Я павінен быў стаць піяршчыкам, але так склалася, што на 3-м курсе атрымаў прапанову дапамагчы ў адным тэлевізійным праекце. Ну, а «Сузор'е надзей» стала для мяне вялікай стартавай пляцоўкай, дзякуючы якой мяне размеркавалі ў Белтэлерадыёкампанію. Тады для ўраджэнца Бабруйска застацца ў Мінску было шанцаваннем.

— Калі толькі пачыналі працаваць на БТ, якім тэлебачаннем захапляліся?

— У той час я жыў альбо ў інтэрнаце, альбо на здымных кватэрах. Працы — шмат, а таму тэлевізар я амаль не глядзеў. Праўда, тады толькі-толькі з'явіўся Comedy club, мне па-сапраўднаму стала цікава. І нават з'явілася ідэя: «Вось бы сябе там паспрабаваць». І хаця я не быў удзельнікам каманды КВЗ, усё роўна туды трапіў.

«Людзі адляталі ад быкоў, як тканінныя цацкі»

— Якія тэлепраекты са сваім удзелам лічыце найбольш удалымі?

— Мюзікл «Паўлінка NEW», «Бітва тытанаў»...

— А літаральна сёння даведаўся, што зараз вы здымаецеся ў фільме пад назвай «Яны».

— Раней я іграў у серыяле «Вышэй за неба», а тое, што раблю зараз, гэта, хутчэй, грамадскія пачаткі. Я не рызыкну назваць гэта сур'ёзнымі здымкамі для сябе. У мяне маленькая роля на тры хвіліны. Праект небюджэтны. Здымае ўсё Дзіяна Цыкунова, рэжысёр-аматар, дзяўчынка-адзінацыкласніца, якая марыць стаць прафесіяналам. Але я ў яе веру. І хачу ўбачыць яе рэжысёрам, які возьмецца за вялікае бюджэтнае кіно.

Сёння вырасла цэлае пакаленне «вялікага пальца», — людзі, зняволеныя смартфонамі і планшэтамі...

— Вы неяк сказалі, што не пайшлі вучыцца на акцёра, бо ім можна стаць без спецыяльнай адукацыі. А ці збіраецеся самі атрымаць яшчэ адзін дыплом?

— Я думаю, што так. Магчыма, ён будзе звязаны з філалогіяй, лінгвістыкай, а можа, і з гісторыяй. Пакуль канкрэтна сказаць не магу.

— Дарэчы, тэлевізійны праект «Бітва тытанаў» здымалі ў Францыі, дзе вас пастаянна акалялі замежнікі. Валоданне замежнай мовай спрыяла працы?

— Безумоўна. Без гэтага мы б нічога і не знялі. Многія прома-ролікі здымалі ў даволі складаных умовах, бо для гэтага мы запрашалі людзей наўпрост з вуліцы. А еўрапейская публіка да падобнага ставіцца даволі асцярожна. Для гэтага трэба атрымаць шмат дазволаў у Францыі. Мы пра тое не ведалі, а таму, напэўна, і знялі.

Гэты праект, дарэчы, здымалі пад Парыжам, а пражывалі мы ў розных гарадах. Напрыклад, жылі насупраць Ла Сантэ, самай буйной французскай турмы, а самі нават не ведалі аб гэтым.

— Удзел у праекце быкоў дабаўляў асаблівую «разынку». Траўматычных выпадкаў хапала?

— Людзі траплялі пад быкоў і адляталі, як тканінныя цацкі. Але самы драматычны выпадак здарыўся з украінскай спартсменкай. Яна, прафесійны баксёр, напрыканцы адной з эстафет зламала нагу. Гэта было вельмі трагічна.

— Сумнае відовішча, насамрэч...

— Часам у сумнае відовішча ператвараліся расійскія балельшчыкі. Часам Дзмітрый Нагіеў, вядучы расійскай версіі, дазваляў сабе правакацыі, якія пасля прайшлі ў эфір тэлебачання. З беларускай каманды хацелі зрабіць пасмешышча. Хаця мы былі самымі моцнымі канкурэнтамі і расіяне ўвесь час баяліся, што мы іх пераможам. Для іх гэты праект быў прынцыповым. Расія ў ім 10 гадоў, і ім абавязкова трэба заўжды паказваць, як яны перамагаюць.

— У «Нашай раніцы» вы працуеце з 2006 года. Хто з гасцей праграмы вас найбольш уразіў?

— Да нас прыходзіла вельмі шмат людзей. Апошнім адкрыццём для мяне стаў інтэрнэт-персанаж Наталля Трэя. Я раней не ведаў пра яе, але, як аказваецца, яна даволі вядомы персанаж у сеціве. Наталля — беларуска, жыве ў Маскве. У яе страшэнна прыгожыя каляровыя кліпы, якія яна робіць самастойна. «За кадрам» я задаваўся пытаннем, як знайсці да яе падыход, раскрыць асобу для сябе, для гледача. Мне здавалася, гэта будзе складана. У выніку чалавек паказаў сябе настолькі цікавай, непасрэднай, глыбокай асобай, што мне хацелася ёй апладзіраваць.

— А ці прапаноўвалі вы для ўдзелу ў праграме сваіх кандыдатаў?

— Так, я даволі часта запрашаў тых, хто мог бы быць цікавым у эфіры. Гэта нармальная практыка, калі вядучы не проста гаворыць, але і актыўна ўдзельнічае ў стварэнні праекта. Можна з героем пагаварыць так, што ў тэлегледача працягнецца сон, а можна з усяго гэтага зрабіць невялічкае шоу з правакацыямі. Некаторыя праграмы былі настолькі эмацыйнымі арэлямі, што мы не толькі рагаталі, але і задавалі пытанні, якія прабівалі чалавека на слязу. Мне здаецца, што на нашым тэлебачанні якраз не хапае жанру эмацыйнага інтэрв'ю. Дзелавых, аналітычных гутарак хапае, а вось такіх, як, напрыклад, робяць у Расіі ў рамках шыкоўнай праграмы «Сам-насам з усімі», у нас замала. І гэта менавіта той фармат ток-шоу, у якім я хацеў бы сябе праявіць.

— Даволі эмацыйнымі атрымліваюцца невялічкія гутаркі ў таго ж Івана Урганта...

— Па фармаце яны падобныя. Але праграма Урганта — не адкрыццё. Шмат такіх шоу, з якіх ствараюць гумарыстычныя свята, карнавал, зроблена ў ЗША. А я кажу пра праграму, у якой чалавек у незнаёмых умовах, без гальштука, калі афіцыйная асоба, адказвае на пытанні, звязаныя не толькі з яго прафесіяй, але і з перажываннямі. На мой погляд, нашым людзям вельмі не хапае чалавечых душаў, раскрытых на айчынным экране. Ці ахвотна расказваюць пра сябе чыноўнікі? Не. А пасля кажуць, што пра іх ніхто не ведае. Ёсць прычыны, праз якія людзі, пра якіх гледачы павінны ведаць, наадварот, хаваюцца за спінамі сваіх памочнікаў. І іх інтэрв'ю — 30-секундны запіс у праграме навін. Гэта тычыцца і артыстаў, і спартсменаў.

Спробай эмацыйнага інтэрв'ю з'яўляецца рубрыка «За кубачкам кавы Якабс» падчас «Нашай раніцы». Але яе хранаметраж — 6 хвілін. За гэты час можна абмяняцца камплімentамі, запытацца пра планы. За гэты час «разварушыць» чалавека вельмі складана.

— А ці не было жадання рабіць падобны праект для газет ці часопісаў?

— Пэўны час я працаваў рэпарцёрам у бабруйскай газеце. Але інтэрв'ю для друкаваных сродкаў масавай інфармацыі — іншая справа. Многае залежыць не толькі ад таго, як скажа герой, але і ад таго, як яго словы надрукуюць. Адзін і той жа адказ можна запісаць па-рознаму. А тэлебачанне не дасць магчымасці зманіць. Калі суразмоўца маўчыць, апускае вочы, як гэта пакажаш у газеце? Рэмаркамі?

— Вам было б цікава, калі б падобная ідэя рэалізавалася ў рамках інтэрнэт-тэлебачання?

— Нягледзячы на тое, што інтэрнэт падаўляе тэлебачанне, многія не ўспрымаюць яго сілы і яшчэ больш баяцца яго. З прычыны занятасці запрасіць кагосьці на тэлебачанне часам немагчыма, а вы кажаце пра інтэрнэт. Зараз менавіта тэлебачанне можа больш гэтаму садзейнічаць.

«Буду вадзіць дзіця ў мастацкія і спартыўныя гурткі»

— Мой старэйшы таварыш неяк сказаў наступнае: «Да трыццаці гадоў жыццё ішло павольна, я нікуды не спяшаўся, а пасля яно паляцела, не паспяваеш за ім». Адчуваеце гэта?

— Безумоўна, асабліва пасля нараджэння дзіцяці. Пачынаеш больш сачыць за часам, думаеш, ці зрабіў ты тое, што планаваў. І больш перажываеш з прычыны таго, што ўжо не маеш магчымасці гэта выканаць.

— Яўген, калі ваша дзіця скажа «Тата, я хачу працаваць на тэлебачанні!», якім будзе ваш адказ?

— Я б спытаў: «А што ты для гэтага робіш? Я не вазьму за ручку і не павяду цябе. А калі ў цябе не атрымаецца? Я буду максімальна спрыяць твайму развіццю». Пастараюся запаўняць кожную хвіліну свайго дзіцяці і вадзіць яго ў мастацкія, спартыўныя і музыкальныя гурткі. Так, магчыма, будзе крыху жорстка. Але я лічу, што гэта зараз неабходна. Чым больш сёння займаеш дзіця, тым больш выгодна ён будзе выглядаць на фоне сваіх аднагодак. Бо сёння вырасла цэлае пакаленне «вялікага пальца», — людзі, зняволеныя смартфонамі і планшэтамі...

Тарас ШЧЫРЫ.
taras@zviazda.by

ПРЫШЧАПІ ГРУШУ НА ВЯРБУ

Да верасня тэлевізійная гульня «Размаўляем па-беларуску», якая ідзе на тэлеканале «Беларусь 3», — у адпачынку разам са стваральнікамі. Але ж паўторы папулярнай праграмы — у эфіры. І стваральнікі паклапаціліся пра тых, хто не збіраецца прыпыняцца ў вывучэнні беларускай мовы, і падрыхтавалі арыгінальныя версіі друкаваных выпускаў. Ці ведалі вы, што азначае:

Верзці грушы на вярбе. Жыхары Старажытнага Рыма, пачуўшы чыюсьці балбатню, маглі глыбакадумна зазначыць: дурны гаворыць усё, што прыйдзе да галавы. «Пустая мельница без ветра мелет» — характарызуе баюна расійская прымаўка. Пра змест такога аповеду — «развесистая клюква». Немец задуменна дадасць: «Апавядае, як у яго выраслa дзюба». Ну, а беларус, пачуўшы, як нехта нясе поўную бязглуздзіцу, махне рукою ды падсумуе: «Вярзе грушы на вярбе». Верзці грушы на вярбе — значыць расказваць пра тое, чаго няма і быць не можа.

Бабін кут. Жытло нашых продкаў было зусім непадобным на гарадскія кватэры і тыя дамы, што будуюць зараз у вёсцы. Раней жылая прастора хаты была даволі ўніверсальнай: у адным памяшканні і спальня, і зала, і кухня, і гасцёўня. Тым не менш патрыярхальнай сям'і не было цесна на такой невялікай плошчы. Кожнаму прадмету выдзялялася сваё месца. Для работы і адпачынку былі адведзены свае зоны. Было такое месца і ў гаспадыні, звалася яно «бабін кут». Насупраць вусця печы, каля ўвахода, дзе на лаве — драўляныя вёдры, дзёнка, карцы, гаспадыня займалася прыгатаваннем страў. У бабіным куце ўсякаму посуду: і міскам, і гаршкам, і гладышам, і лыжкам — сваё месца. Вопытныя гаспадыні ведалі: каб захаваць прыбытак і дабрабыт у сям'і, у бабіным куце трэба падтрымліваць парадак. «У іх каўшы — не дрэмлюць, дзежка — не пустуе, печ — не чадна», — так гаварылі пра спрытных ды клапатлівых, што былі галоўнымі па гаспадарцы, кухарылі ды прыбіралі. Словам, з ранку да вечара ў бабіным куце знаходзілі сабе справу.

Каб стаць удзельнікамі праграмы, неабходна зайсці на сайт tvrgomel.by або 3belarus.by і праз банер «Размаўляем па-беларуску» запоўніць заяўку на каманду з трох чалавек. Паўторы выпускаў тэлевіктарыны — у эфіры «Беларусь 3» кожную суботу ў 11.10—11.25.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.
astashkevich@zviazda.by

«ЛЮБІЦЬ БЕЛАРУСЬ!»

Далучайцеся да маштабнай акцыі!

У новым тэлевізійным сезоне 2015-2016 «Беларусь 3» прапануе сваім гледачам пазнаёміцца з нацыянальнай культурай, палепшыць веданне роднай мовы і дакрануцца да песеннай спадчыны: напрыканцы жніўня тэлеканал сумесна з Рэспубліканскім грамадскім аб'яднаннем «Белая Русь» і ансамблем «Бяседа» распачне маштабную акцыю «Любіць Беларусь!».

«Беларусь 3» запрашае атрымаць асалоду ад гукаў роднай музыкі і дакрануцца да нацыянальнай культуры! Восенню ансамбль «Бяседа» і вядучая праграм «Размаўляем па-беларуску» і «Дыя@блог. Пра мову» на «Беларусь 3» Алена Трацэнка здзейсняць падарожжа па ўсёй краіне. З канцэртнымі праграмамі яны наведаюць абласныя цэнтры і буйныя гарады Беларусі. А 10 кастрычніка ў Мінску адбудзецца фінальны гала-канцэрт.

Тым, хто не зможа трапіць на канцэрт у сваім горадзе, не варта засмучацца: тэлегледачы змогуць убачыць фрагменты канцэртаў, пазнаёміцца з гісторыка-культурнай спадчынай беларускіх гарадоў, даведацца, чым жывуць розныя рэгіёны Беларусі, у спецыяльна падрыхтаваным цыкле праграм, які выйдзе на «Беларусь 3».

ПАНЯДЗЕЛАК, 24 ЖНІЎНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 23.30 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.10 Зона Х.
9.10 Галоўны эфір.
10.25, 20.00 Серыял «Цікаўная Варвара».
11.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.40 Меладрама «Шлях да сэрца мужчыны».
13.40, 15.55 Меладрама «Мая любімая пачвара». 1-я і 2-я серыі.
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
17.35 Беларуская часінка.
19.20 Арэна.
21.00 Панарама.
21.40 Серыял «След».
23.50 Дзень спорту.
0.00 Меладрама «Анюціна шчасце». 1-я і 2-я серыі.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 10.35, 21.35 Тэлебарометр.
9.05, 16.15 Серыял «Каўчэг».
11.05 Анімацыя для ўсёй сям'і. «Смурфікі 2».
12.45 Меладрама «Мора. Горы. Керамзіт». Заключныя серыі.
17.55, 1.05 Серыял «Сышчык без ліцэнзіі». 1-я серыя.
19.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».

21.00 Мазгавы штурм.
21.40 КЕНО.
21.45 Дак. цыкл «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
22.40 Рэпарцёр.
23.25 Серыял «Косці».
0.15 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».

БЕЛАРУСЬ 3

7.35 «Дабраранак».
8.00 М/ф.
8.30, 12.25, 15.55, 23.20 «Калейдаскоп».
8.40, 19.15 «Ідэальны муж». Драма.
10.10, 21.05 «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
10.35 Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
11.30 «Наперад у мінулае».
11.55 «Грані Перамогі». Дзень Перамогі.
12.35 «Лісце каштанаў». Тэлеспектакль.
14.05 «АРТіШОК». Спявачка Паліна Рэспубліка.
14.35 «Музычная гісторыя». Камедыя.
16.05 «Агонія». Драма. 1-я і 2-я серыі.
18.25 «Чорная рука». Дак. фільм.
20.45 «Калыханка».
21.30 «Маё каханне». Кінаповесць.
22.50 «Разам з ім». Дак. фільм.

БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 7.30, 0.45 PRO спорт. Навіны.
7.15 Спорт-мікс.
7.50 Авертайм.
8.15 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Тарпеда-БелАЗ» — «Дынама» (Мінск).
10.00 Хакей. КХЛ. «Мядзведзешчак» (Заграб) — «Ёкерыт» (Хельсінкі).
11.55 Тэніс. Турнір ВТА. Цынцынаці. Фінал.
13.55 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
16.45 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
17.40 Баскетбол. 3х3. Чэмпіянат Еўропы. U-18.
18.40 Час футбола.
19.25 Хакей. КХЛ. Кубак адкрыцця. СКА (Санкт-Пецярбург) — ЦСКА (Масква).
21.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Ліверпуль».
23.50 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.00 «Жыць здорава!».
11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.55 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 Маст. фільм «Каханне і галубы».
16.20 «Вучыцца жыць».
16.50 «Давай пажэнімся!».
18.20 «Адваротны адлік». «Космас Чурлёніса. Беларускія матывы».
18.55 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 «Справа прынцыпу».
22.15 Канцэрт групы «Любэ».
0.40 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.25 «Дакументальны праект»: «Непрыдатныя здольнасці».
10.20 «Далёкія сваякі».
10.40 Серыял «Салдаты 9».
11.30 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!».
13.50 «Ежа багоў».
14.45 «Дарагая перадача».
15.10 «Чыстая праца».
15.55 «Іншая краіна». «Узбекістан: месца пад сонцам».
16.50 «Вялікі горад».
17.35 «Званая вячэра».
18.35 «Дакументальны праект»: «Іншапланецяне таксама людзі».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Ваенная тайна».
23.00 Маст. фільм «У пошуках Эрыка».
1.00 «Дакументальны праект»: «Зямля. У пошуках стваральніка».

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Беларусь сёння».
9.30, 2.35 Маст. фільм «Майская ноч».
11.10 «Зроблена ў СССР».
11.40 Маст. фільм «Падкідыш».
13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 1.40 «Давайце разбяромся!».
14.15, 4.15 Серыял «Мужчына ўва мне».
16.20, 0.45 Ток-шоу «Слова за слова».
17.15 Серыял «Маўклівы сведка».
19.25 Маст. фільм «На свеце жывуць добрыя і харошыя людзі».
21.20, 23.15 Серыял «Калыска над бездонню».
0.35 Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
10.55 Надвор'е на тыдзень.
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.35, 17.10 «Мая планета».
12.25 Маст. фільм «Іван».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.30 «Прамы эфір».
18.00 Меладрама «Будзе светлым дзень».
20.55 «Асаблівы выпадак».
21.55, 23.10 Серыял «Паміж намі, дзяўчатамі».
0.35 Серыял «Вечны кліч».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «Сонечна. Без ападкаў».
8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Сёння.
10.20 Серыял «Дарожны патруль».
12.00 «Суд прысяжных».
13.15 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.20 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.45 «Ядзім дома».
15.10, 16.20 Серыял «Масква. Тры вакзалы».
17.55 Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
19.40 Серыял «Настаўнік у законе. Вяртанне».
21.15 Серыял «Шэф».
23.25 Серыял «Знакі лёсу».

8 КАНАЛ

7.00, 14.05, 19.40, 21.00, 23.15 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30 Драма «Няўлоўны».
8.55 Камедыя «Міміно».
10.30, 18.00 «Аналітычная праграма».
10.40 Трылер «На кручку».
12.35 «Кінаблакнот».
12.45, 13.50, 15.00, 16.25, 18.10, 19.25, 20.55 «Хатняя крама».
13.00 Серыял «Страла».
14.10 Дак. серыял «Кошкі».
15.15 Серыял «Рабыня Ізаўра».
16.10 «Золата маўчання».
16.35 Серыял «Сотня».
18.15 Серыял «Я чую голас твой».
19.45 Серыял «Горад гангстараў».
20.45 «Вечарніца».
21.05 Трылер «Нешта».
22.50 Серыял «Байкі са склепа».
23.20 «Хобі + TV».

ВТВ

6.00, 5.20 «PLAY».
7.00, 13.15 «Ералаш».
7.30, 15.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
8.00, 17.30, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30 Серыял «Супер Макс».
9.00, 18.00, 23.30 Серыял «Васьмідзясятыя».
10.00, 19.00 Серыял «Апошні з Магікян».
11.00 Трагікамедыя «1+1».
13.30 Серыял «Калыска над бездонню».
14.30, 3.00 «Ведаць будучыню. Жыццё пасля Вангі».
16.00 «Паспець за 24 гадзіны».
17.00, 5.00 «Лаві момант».
20.00 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».
21.10 Камедыя «Неабдуманы».
23.20, 4.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
0.30, 4.00 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «90210: Новае пакаленне».

КУЛЬТУРА

7.00 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.00, 23.45 Навіны культуры.
10.20 «Барыс І». Маст. фільм. 1-я серыя. «Вадохрышча». Частка 1-я.
11.25 «Вярэя. Вяртанне да сябе». Дак. фільм.
12.05 Чалавек перад Богам. «Споведзь, малітва і пост».
12.35 Да 65-годдзя Валерыя Беляковіча. «Лінія жыцця».
13.25, 21.30 80 гадоў Юрыю Клепікаву. «Не баліць галава ў дзятла». Маст. фільм.
14.40, 17.20, 22.45 «Сусветныя скарбы культуры».
15.10 «Хмуры Вангур». Маст. фільм.
16.40, 0.55 «Гісторыя кінаначальнікаў, або Будаўнікі і перабудоўшчыкі. 1960-я гады». Дак. серыял. 1-я серыя.
17.35 «Успамінаючы вялікія старонкі. Сольныя спевы». Частка 1-я.
18.30 «Хто мы?» «Першая сусветная». Фільм «У гарах і пралівах».
19.15 «Добрай ночы, малыя!»
19.30 «Міхаіл Ульянаў. Чалавек на ўсе часы». Дак. фільм.
20.10 «Абсалютны слых».
20.50 80 гадоў Юрыю Клепікаву. «Прычыны для жыцця». Дак. фільм.
23.00 Сведкі часу. «Мая Тураўская. Асколкі». Дак. серыял. 1-я серыя.
0.00 Мастсавет.
0.05 «Фабержэ. Страчаны і набыты». Дак. фільм.
1.35 «Харун-аль-Рашыд». Дак. фільм.
1.40 «Паліглот». Вывучым французскую за 16 гадзін! № 13.
2.25 Р. Шчадрын. «Карагоды». Канцэрт для аркестра.

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 0.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1975. Паўтор ад 2011 года.
7.15 Фільм-канцэрт Б. Грабеншчыкова і групы «Акварыум». 1990 год.
8.10, 11.05, 12.45, 15.15, 17.30, 21.40, 23.00, 0.55, 2.10, 3.40, 4.55 Музычная настальгія.
8.35, 15.00 М/с «Болек і Лёлек на канікулах».
9.00 «Быў час». Ад 23.08.2009 года.
10.00 Маст. фільм «Мае дарагія».
12.00 «Акулы пяра». Алёна Апіна. 1995 год.
13.05 Фільм-канцэрт «Дзве гадзіны з бардамі». 1987 год.
16.00 Маст. фільм «І чорт з намі...»
18.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Масквічы». 2005 год.
19.10 Кінаальманах «Таварыш песня».
20.40 М/ф «Як казакі іншапланецян сустракалі».
21.00, 3.00 «Мінулы час».
22.00 «Народжаныя ў СССР».
1.10 Маст. фільм «Мары насустрач».
2.35 М/ф «Як казакі нявест выручалі».
4.00 «Рабіна на каньяку». Музычны капуснік у тэатры-студыі А. Табакова. 1989 год.

EUROSPORT

3.30, 23.45 WATTS.
3.45 Аўта- і мотаспорт.
4.00, 9.00, 12.00, 13.45, 19.00, 21.00, 0.00, 2.30 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
8.45, 13.30, 16.45 Лёгкая атлетыка. Грын лайт.
9.30 Стральба з лука. Кубак свету.
10.00 Веласпорт. Pro Cycling Challenge. ЗША.
11.00, 17.00, 20.00, 22.30, 1.30 Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі.
18.45 Веласпорт.

КАМЕДЫЯ

6.00, 9.35, 3.00 Серыял «Я і місіс Джонс».
6.40 Камедыя «Два ў адным».
8.10 Камедыя «Той яшчэ Карласан!».
10.40 Камедыя «Модная штучка».
12.20 Камедыя «Любовь-морковь 3».
14.00, 14.45, 15.25 «Камедыянты (Шоу)».
14.25, 15.10, 5.40 Скетчком «Паміж намі».
16.00 Камедыя «Хросныя бацькі».
17.40, 22.00 Серыял «Татуся».
18.40 Камедыя «Ох, ужо гэтыя дзеці».
20.20 Камедыя «Ох, ужо гэтыя бацькі».
23.10 Камедыя «Учора, сёння, заўтра».
1.15 Камедыя «Джэнтльмены, удачы!».
4.00 Камедыя «Махляры».

ТБ3

6.00 М/ф.
7.35 «Дачныя гісторыі».
8.00, 18.50, 2.00 Серыял «Забароненае каханне».
9.35, 4.25 Дак. серыял «Судовыя страсці».
10.25, 5.10 Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
11.20, 16.50 Дак. серыял «Справа Астахава».
12.15 Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
13.10 Маст. фільм «Насуперак здаровому сэнсу».
14.55 «Нераскрытыя тайны».
15.50 «Шчырая гутарка».
17.50 Серыял «Тайны следства».
20.45, 0.20 Серыял «Двайное жыццё».
22.40 «Зорныя гісторыі».
23.35 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
3.30 «Часова даступны».

ТБ1000

7.00 Трагікамедыя «Пакуль не згуляў у скрыню».
8.50 Камедыя «Уік-энд у Парыжы».
10.30 Драма «Разня».
11.55, 0.00 Меладрама «Вечнае ззянне чыстага розуму».
13.45 Прыгоды «Гары Потэр і ордэн Фенікса».
16.05 Драма «Мой хлопец — псіх».
18.10 Драма «Тайная цяга».
20.00 Камедыя «Дом Хэмінгуэя».
21.40 Драма «Гавана, я люблю цябе».
2.00 Камедыя «Нагледзеўшыся дэтэктываў».
4.00 Драма «Прыгавор».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Дэтэктыў «Сышчык Пуцілін. Дом спатканняў».
8.10 Трагікамедыя «Пра жонку, мару і яшчэ адну...».
9.40 Драма «Злачынства і пакаранне».
13.35 Камедыя «Прывітанне, я ваш тата!».
15.05 Драма «Юда».
17.05 Дэтэктыў «Атэль».
18.45 Драма «Клас карэкцыі».
20.20 Камедыя «Лёгкі на ўспамін».
21.50 Камедыя «Змешаныя пачуцці».
23.25 Драма «Каляфутбола».
1.05 Меладрама «Паралельныя светы».
2.35 Драма «Злачынства і пакаранне».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00, 11.50 Скарбашукальнікі.
6.50, 8.05, 23.00, 3.10 Навуковыя недарэчнасці.
7.15 Зрабі або памры.
8.30, 13.30, 19.20 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
9.20, 14.20, 20.10 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас.
10.10, 16.50, 3.40 Супербудаванні Трэцяга рэйха.
11.00 Мегазаводы.
12.40 Папулярная навука.
13.05 Гульні розуму.
15.10 Паляўнічы на прэснаводных гігантаў.
16.00 Дзікая прырода Амерыкі.
17.40 Дзікае надвор'е.
18.30, 21.50, 2.00, 5.15 Навука будучыні.
21.00, 1.10, 4.30 Наступнае мегацунамі.
22.40, 2.50 Код небяспекі.
23.30 Расследаванні авіякатастроф.
0.20 Уварванне на Зямлю.

DISCOVERY

8.00, 10.55, 15.55, 21.20 Як гэта зроблена?
8.25, 10.30, 15.30, 21.45 Як гэта ўстроена?
8.50, 11.20 Разбуральнікі легенд.
9.40, 13.50 Аўтальянцы.
12.10, 18.00 Паляўнічыя на склады.
13.00, 6.24 Рэстаўратары лодак.
14.40, 5.36 Горш не бывае.
16.20, 4.00 З любасці да машын.
17.10, 4.48 Махінатары.
18.50 Цяпер ірване.
19.40 Катастрофа на колах.
20.30 Інжынерныя пралікі.
22.10 Пешшу ўздоўж Амазонкі.
23.00 Выжыць разам.
23.50 Выжыванне без купюр.
0.40 Кубінская акула.
1.30 Акулы з іншага свету.
2.20 Маланкавыя катастрофы.
2.45 Сапраўдныя аферысты.
3.10 Паляўнічыя на рэліквіі.
7.12 Top Gear.

АЎТОРАК, 25 ЖНІЎНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.15 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.35 Зона Х.
9.10, 22.10 Серыял «След».
10.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
11.05, 20.00 Серыял «Цікаўная Варвара».
12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».
13.05 Дзень у вялікім горадзе.
14.05 Серыял «Дзявочае паляванне».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 0.45 Дэтэктыў «Выходжу цябе шукаць».
17.35 Беларуская часінка.
19.20, 23.55 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.40 Буйным планам.
0.30 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.30 Тэлебарометр.
9.05, 14.20 Серыял «Каўчэг».
10.40 Дак. цыкл «Экстрасэнсы-дэтэктывы».
11.40, 1.00 Серыял «Косці».

12.30, 19.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
16.00 «Арол і рэшка. Шопінг».
17.00, 0.20 «Пін-код».
17.55 Серыял «Сышчык без ліцэнзіі».
21.00 Мазгавы штурм.
21.35 Спортлато 6 з 49, КЕНО.
21.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Матч у адказ.
23.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.
1.45 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».

БЕЛАРУСЬ 3

7.25 «Дабраранак».
7.55 М/ф.
8.30, 13.50, 18.05, 1.00 «Калейдаскоп».
8.40, 16.15 «Пудзіла». Драма. 1-я і 2-я серыі.
10.30 «У гасцях у Барыса Аверына». Сустрэча з кінарэжысёрам Аляксандрам Сакуравым.
11.50, 23.30 «Жалобная бяздушнасць». Драма.
13.20 «Святло далёкай зоркі». Памяці паэта Петруся Макаля.
14.00 «Маё каханне». Кінаповесць.
15.15 «Разам з ім». Дак. фільм.
15.45 «Азёрная адысея». Возера Свіцязь.
18.15 «Жыццё і лёс». Драма.
20.45 «Калыханка».
21.05, 23.00 «СССР — музыка пад забаронай». Уладзімір Высоцкі.
21.30 «Асенні марафон». Трагікамедыя.

БЕЛАРУСЬ 5

7.15, 7.45, 0.35 PRO спорт. Навіны.
7.30, 13.35 Спорт-мікс.
8.05, 13.55 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
10.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
11.45 Хакей. КХЛ. Кубак адкрыцця. СКА (Санкт-Пецярбург) — ЦСКА (Масква).
16.10 Час футбола.
16.55 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Арсенал» — «Ліверпуль».
18.50 Спорт-кадр.
19.25 Хакей. КХЛ. «Спартак» (Масква) — «Дынама» (Мінск).
21.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Матчы ў адказ. Анлайн гульнявога дня.
23.40 Еўрапейскі покерны тур.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!»
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.55 «Модны прыгавор».

13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 Серыял «Дурная кроў».
16.20 «Вучыцца жыць».
16.50 «Давай пажэнімся!»
18.20 Серыял «Аднакласнікі».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Крык савы».
23.05 Маст. фільм «7 дзён і начэй з Мэрылін».
0.50 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 Маст. фільм «Сотавы».
10.10 «Далёкія сваякі».
10.40 Серыял «Салдаты 9».
11.30 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!».
13.50 «Наша справа».
14.05 «Ежа багоў».
14.45, 23.00 Серыял «Меч».
16.50 «Цэнтральны рэгіён».
17.35 «Званая вячэра».
18.35 «Дакументальны праект»: «Нам пагражае астэроід».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Тэрыторыя памылак».
22.00 «Глядзець усім!».
0.45 «Дакументальны праект»: «Сёмая пячатка д'ябла».

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Агульны інтарэс».
9.30, 3.00 Маст. фільм «Я крочу па Маскве».
11.00 Маст. фільм «На свеце жывуць добрыя і харошыя людзі».
13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 2.10 «Давайце разбяромся!»
14.15, 4.15 Серыял «Мужчына ўва мне».
16.20, 1.15 Ток-шоу «Слова за слова».
17.15 Серыял «Маўклівы сведка».
19.25 Маст. фільм «Той, хто гасіць святло».
21.00, 23.15 Серыял «Калыска над бездонню».
0.35 Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30, 0.35 Серыял «Вечны кліч».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.30 «Прамы эфір».
17.10 «Жыццё нялёгкае... Сяргей Даўлатаў».
18.00 Меладрама «Будзе светлым дзень».

20.55 «Асаблівы выпадак».
21.55, 23.10 Серыял «Паміж намі, дзяўчатамі».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «Сонечна. Без ападкаў».
8.10 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Сёння.
10.20 Серыял «Дарожны патруль».
12.00 «Суд прысяжных».
13.15 «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
14.20 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
14.45 «Справа густу».
15.10, 16.20 Серыял «Масква. Тры вакзалы».
17.55 Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
19.40 Серыял «Настаўнік у законе. Вяртанне».
21.15 Серыял «Шэф».
23.25 Серыял «Знакі лёсу».

8 КАНАЛ

7.00, 14.05, 19.40, 21.00, 23.20 «Надвор'е».
7.05, 16.00 Мультпарад.
7.30, 19.45 Серыял «Горад гангстараў».
8.30, 18.15 Серыял «Я чую голас твой».
9.35, 12.55, 13.50, 15.45, 16.30, 18.10, 19.25, 20.55 «Хатняя крама».
9.45 Дак. фільм.
10.15 «Хобі + TV». «Свой фермер».
11.15 Трылер «Нешта».
13.00 Серыял «Страла».
14.10 Дак. серыял «Коткі».
15.00 Серыял «Рабыня Ізаўра».
16.20 «Золата маўчання».
16.40 Серыял «Сотня».
20.45 «Вечарніца».
21.05 «Даведнік па краінах і кантынентах».
21.15 Камедыя «Каханне з рызыкай для жыцця».
22.50 Серыял «Байкі са склепа».
23.25 «Хобі + TV».

ВТВ

6.00, 5.20 «PLAY».
7.00, 13.00 «Ералаш».
7.30, 15.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
8.00, 17.30, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30 Серыял «Супер Макс».
9.00, 18.00, 23.30 Серыял «Васьмідзясятыя».
10.00, 19.00 Серыял «Апошні з Магікян».
11.00 Камедыя «Неабдуманы».
13.30 Серыял «Калыска над бездонню».
14.30, 3.00 «Ведаць будучыню. Жыццё пасля Вангі».
16.00, 20.00 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».
17.00, 5.00 «Лаві момант».
21.10 Баявік «Таксі».
23.10, 4.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
0.30, 4.00 «Дурні і дарогі».
1.00 Серыял «90210: Новае пакаленне».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00, 15.00, 19.00, 23.45 Навіны культуры.
10.20 «Барыс І». Маст. фільм. 1-я серыя. «Вадохрышча». Частка 2-я.
11.25 «Пісьмы з правінцыі». Дзун-Хемчык. (Рэспубліка Тыва.)
11.55 Чалавек перад Богам. «Богаслужэнне».
12.20 «Фабержэ. Страчаны і набыты». Дак. фільм.
13.10 «Вобразы вады». Дак. фільм.
13.25, 21.30 85 гадоў Георгію Данелія. «Сярожа». Маст. фільм.
14.40, 17.20, 22.45, 2.40 «Сусветныя скарбы культуры».
15.10 «Бывай, XX стагоддзе! Уладзімір Максімаў».
15.50, 1.55 «Паліглот». Вывучым французскую за 16 гадзін! № 13.
16.40, 0.45 «Гісторыя кінаначальнікаў, або Будаўнікі і перабудоўшчыкі. 1970-я гады». Дак. серыял.
17.35 «Успамінаючы вялікія старонкі. Сольныя спевы». Частка 2-я.
18.30 «Хто мы?» «Першая сусветная». Фільм «Героі і здраднікі».
19.15 «Добрай ночы, малыя!»
19.30 «Марына Ладыніна. Кіназорка паміж сярпом і молатам». Дак. фільм.
20.10 «Абсалютны слых».
20.50 85 гадоў рэжысёру. «Георгій Данелія. Паміж выдумкай і рэальнасцю». Дак. фільм.
23.00 Сведкі часу. «Мая Тураўская. Асколкі». Дак. серыял.
0.00 Мастсавет.
0.05 «Скарбы «Прусіі». Дак. фільм.
1.25 «Эрнэст Рэзерфорд». Дак. фільм.
1.35 Ф. Шуберт. Інтрадукцыя і варыяцыі.

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «Акулы пяра». Алёна Апіна. 1995 год.
6.45, 9.15, 11.30, 15.40, 17.00, 18.35, 20.05, 21.40, 23.00, 23.40, 2.10, 5.05 Музычная настальгія.
7.05 Фільм-канцэрт «Дзве гадзіны з бардамі». 1987 год.
9.00, 2.35 М/с «Болек і Лёлек на канікулах».
10.00 Маст. фільм «І чорт з намі...»
12.00 «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Масквічы». 2005 год.
13.10 Кінаальманах «Таварыш песня».
14.40 М/ф «Як казакі іншапланецян сустракалі».
15.00, 21.00 «Мінулы час».
16.00, 22.00 «Народжаныя ў СССР».
18.00 «Смяяцца, сапраўды, не грэшна». 2-я частка.
19.00 Маст. фільм «Калі ёсць ветразі».
20.35 М/ф «Як казакі ў хакей гулялі».
23.30 «Сядзі і глядзі». 2005 год.
0.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1975. 2-я частка. Паўтор ад 2011 года.
1.15 Фільм-канцэрт Б. Грабеншчыкова і групы «Акварыум». 1990 год.
3.00 «Быў час». Ад 23.08.2009 года.
4.00 Маст. фільм «Мае дарагія».

EUROSPORT

4.00 Веславанне. Чэмпіянат свету па веславанні на байдарках і каноэ.
5.00, 10.45, 16.15, 17.00, 20.00, 22.30, 2.30 Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі.
6.30 Футбол. Старэйшая ліга футбола. «Лос-Анджэлес Гэлаксі» (ЗША) — «New York City FC» (ЗША).
8.00, 11.45, 13.30, 19.00, 21.00, 0.30 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
9.30, 2.00 Конны спорт. Чэмпіянат Еўропы.
13.15, 16.00 Лёгкая атлетыка. Грын лайт.
16.45, 18.45 Веласпорт.
23.30 Мотагонкі.
0.00 Аўтагонкі. Суперкубак Паршэ.

КАМЕДЫЯ

6.00, 3.00 Серыял «Я і місіс Джонс».
6.40 Камедыя «Той яшчэ Карласан!»
8.05 Камедыя «Любовь-морковь 3».
9.45, 18.00 Серыял «Татуся».
10.45 Камедыя «Хросныя бацькі».
12.25 Камедыя «Ох, ужо гэтыя дзеці».
14.00, 14.45, 15.25 «Камедыянты (Шоу)».
14.25, 15.10, 20.05, 22.50, 0.55, 5.40 Скетчком «Паміж намі».
16.00 Камедыя «Учора, сёння, заўтра».
18.35 Камедыя «Ох, ужо гэтыя бацькі».
20.20 Камедыя «Ох, ужо гэты адпачынак».
22.00 Серыял «Месяцовы хлопчык». 1 і 2 серыі.
23.10 Камедыя «І не чырванее».
1.15 Камедыя «Модная штучка».
4.00 Камедыя «Джэнтльмены, удачы!»

ТБ3

6.00 М/ф.
7.30 «Дачныя гісторыі».
7.55, 18.55, 2.05 Серыял «Забароненае каханне».
9.30, 3.55 Дак. серыял «Судовыя страсці».
10.20, 4.40 Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
11.15, 17.00 Дак. серыял «Справа Астахава».
12.10 Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
13.05, 17.55 Серыял «Тайны следства».
14.00, 3.30 «Простыя складанасці».
14.30, 22.45 «Зорныя гісторыі».
15.25, 5.30 «Нераскрытыя таямніцы».
16.00 «Шчырая гутарка».
20.45, 0.25 Серыял «Двайное жыццё».
23.40 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

ТВ1000

6.15, 16.10 Фантастыка «Місія «Серэніці».
8.30 Меладрама «Сямейка Джонс».
10.30 Драма «12 гадоў рабства».
12.50, 0.30 Камедыя «Дагары нагамі».
14.20 Камедыя «Замуж на 2 дні».
18.20 Камедыя «Настаўнік англійскай».
20.00 Фантастыка «Дывергент».
22.20 Драма «Прэстыж».
2.00 Камедыя «Дарослая нечаканасць».
4.00 Меладрама «Да цуду».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Камедыя «Вечары на хутары ля Дзіканькі».
7.40 Драма «Гамлет XXI стагоддзе».
10.20 Камедыя «Вось гэта каханне!»
12.00, 3.20 Драма «Балі Валтасара, ці Ноч са Сталіным».
13.30 Камедыя «Вясёлая моладзь».
15.05 Меладрама «Начны карчмы агеньчык».
17.05 Драма «9 дзён і адна раніца».
18.40 Камедыя «Кур'ер з «Раю».
20.20 Камедыя «Усё ўключана 2».
22.10 Драма «Географ глобус прапіў».
0.15 Камедыя «Аднакласнікі. ru: НаCLICKай удачу».
2.00 Драма «Гутарка».
4.50 Драма «Узломшчык».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00, 11.50 Скарбашукальнікі.
6.50, 8.05, 17.40, 21.00, 23.00, 1.10, 3.10, 4.30 Навуковыя недарэчнасці.
7.15 Зрабі або памры.
8.30, 13.30, 19.20 Наступнае мегацунамі.
9.20, 14.20, 20.10 Навука будучыні.
10.10, 16.50, 3.40 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
11.00 Мегазаводы.
12.40 Папулярная навука.
13.05 Гульні розуму.
15.10 Паляўнічы на прэснаводных гігантаў.
16.00 Дзікая прырода Амерыкі.
18.30, 21.50, 2.00, 5.15 Папулярная навука.
22.40, 2.50 Код небяспекі.
23.30 Расследаванні авіякатастроф.
0.20 Уварванне на Зямлю.

DISCOVERY

8.00, 10.55, 15.55, 21.20 Як гэта зроблена?
8.25, 10.30, 15.30, 21.45 Як гэта ўстроена?
8.50, 11.20 Горш не бывае.
9.40, 13.50 З любасці да машын.
12.10, 18.00 Паляўнічыя на рэліквіі.
13.00, 6.24 Ашалелая рыбалка.
14.40, 5.36 А ты б выжыў?
16.20, 4.00 Акулы аўтатаргоў з Даласа.
17.10, 4.48 Махінатары.
18.50 Выжыванне без купюр.
19.40 Выжыць разам.
20.30 Пешшу ўздоўж Амазонкі.
22.10 Хуткія і гучныя.
23.00 Калекцыянеры аўто.
23.50 Вулічныя гонкі.
0.40 Акулы-ніндзя.
1.30 Супердрапежнік.
2.20 Маланкавыя катастрофы.
2.45 Сапраўдныя аферысты.
3.10 Скарбы з каморкі.
7.12 Top Gear.

ХТО НА НОВЕНЬКАГА?

Інтрыга дзіцячага «Еўрабачання» вырашыцца сёння

21 жніўня нас чакае фінальнае шоу нацыянальнага адбору на дзіцячы конкурс песні «Еўрабачанне-2015». На гала-канцэрце пасля выступленняў усіх канкурсантаў стане вядома імя пераможцы, які будзе прадстаўляць краіну на песенным марафоне ў Балгарыі.

Адкрываць шоу будуць Елізавета Казак і Алена Тоўсцік з Кобрына. Дзяўчаты займаюцца ва ўзорнай вакальна-эстраднай студыі «Тарарам». Сваё выступленне яны прысвячаюць усім тым, хто здольны прыйсці на дапамогу ў цяжкі час, і людзям, якія жадаюць жыць у згодзе адно з адным пад мірным небам. Другімі на сцэне прадэманструюць свае таленты хлопцы і дзяўчаты з гурта «Нясумны ўзрост» з Мінска. Яны любяць розную музыку ад джаза да эстрады, і ў іх кампаніі ніколі не засумуеш. Канкурсантцы Ангеліне Васілеўскай дастаўся нумар 3 на лёсаванні. Яе дэвіз просты: «Жыццё як ваджэнне веласіпеда: трэба рухацца наперад, каб не ўпасці». І дзяўчына даказвае на справе, як заваёўваць сабе месца пад сонцам: у мінулым годзе яна заняла прызавое месца на міжнародным конкурсе «Berliner Pearl — 2014» і стала лаўрэатам міжнароднага спаборніцтва «Кубак Еўропы-2014». Пад нумарам 4 чакаем выступлення Марыі Новік з Мінска. Юная спявачка займаецца вакалам у Нацыянальным цэнтры музычнага мастацтва імя У. Мулявіна. Захапляецца творчасцю такіх вядомых выканаўцаў, як Amy Winehouse, Pink Floyd, Sia. І заўсёды настроена на тое, каб не здавацца на шляху да запаветнай мары. Выступленне першай пяцёркі завершыць ансамбль «Заранак» (г. Мінск). Гэтая таленавітая каманда ў адрозненне ад іншых выказала жаданне зрабіць дуэт з ансамблем «Непаседы», удзельнікі калектываў вельмі пасябравалі ў «Артэку». Потым нас чакае сустрэча з мінчанінам Аляксандрам Міханьковым. Калі яму ўсё ж удасца заваяваць перамогу і паехаць на «Еўрабачанне», то гэта будзе яго другі конкурс у Балгарыі, бо ў 2012 годзе хлопец ужо вярнуўся адтуль з 1-м месцам пасля ўдзелу ў міжнародным фестывалі-конкурсе «Славянскі вянец». Сёмай пакажа свой талент Марыя Магільная з Магілёва. Сярод яе куміраў — Селін Дыён, Уітні Х'юстан і Максім Фадзееў, але ў вольны час дзяўчынка слухае свежыя хіты. Відаць, гэта дапамагае быць у курсе падзей у музычным свеце. Руслан Асланаў (Мінскі раён) будзе спяваць восьмым. Хлопцу не ў навінку выступленне на вялікай сцэне. Ён дайшоў да суперфіналу на ўкраінскім шоу «Голас. Дзеці» другога сезона, заняў 3-е месца, прадстаўляючы летась Беларусь на «Дзіцячай новай хвалі». Дзявятай змагацца працягне Лізавета Мураўёва (г. Мінск). Дзяўчынка імкнецца як у музыцы, так і ў жыцці ўсё рабіць «на выдатна», бо ведае, што толькі працавітасць гарантуе здзяйсненне мары. А завершыць конкурсныя выступленні нумар мінчанкі Зінаіды Купрыяновіч. Яна таксама мае ўжо свае перамогі, сярод якіх, напрыклад, перамога на «Славянскім базары ў Віцебску — 2014», дзе яна ўзяла І прэмію. Сваё выступленне дзяўчына прысвячае ўсім фанатам конкурсу «Еўрабачанне».

Гала-канцэрт можна будзе ўбачыць 21 жніўня ў прамым эфіры на тэлеканалах «Беларусь 1» і «Беларусь 24».

Алена ДРАПКО.
drapko@zviazda.by

СЕРАДА, 26 ЖНІЎНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.05 Навіны.
7.05, 8.05 Навіны эканомікі.
7.10, 8.10, 19.40, 23.30 Зона Х.
9.10, 22.00 Серыял «След».
10.00, 13.00, 16.00 90 секунд.
10.55, 20.00 Серыял «Цікаўная Варвара».
12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-5».
13.05 Дзень у вялікім горадзе.
14.05 Серыял «Дзявочае паляванне».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25, 0.35 Дэтэктыў «Выходжу цябе шукаць». Заключная серыя.
17.35 Беларуская часінка.
19.20, 23.45 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.40 Актуальнае інтэрв'ю.
0.20 Дзень спорту.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Тэлераніца.
9.00, 21.30 Тэлебарометр.
9.05, 14.30 Серыял «Каўчэг».
10.40, 16.05 «Арол і рэшка».
11.40, 1.00 Серыял «Косці».
12.35, 19.10 Серыял «Не нарадзіся прыгожай».
17.00, 0.20 «Пін-код».
17.55 Серыял «Сышчык без ліцэнзіі».
21.00 Мазгавы штурм.
21.35 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
21.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. «Партызан» — БАТЭ. Матч у адказ.
23.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.
1.45 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».

БЕЛАРУСЬ 3

7.35 «Дабраранак».
8.00 М/ф.
8.30, 13.35, 17.50, 0.35 «Калейдаскоп».
8.40, 18.00 «Жыццё і лёс». Драма.
11.10 «Салдаты памяці». Дак. фільм.
11.40 «Асенні марафон». Трагікамедыя.
13.10 «Святло далёкай зоркі». Памяці мастака Івана Ахрэмчыка.
13.45 «Цырк». Камедыя.
15.15 «Наперад у мінулае».
15.45 «Азёрная Адысея». Возера Атолава, Крывое, Чарбамысла і Глыбокае.
16.10 «Славянскі базар у Віцебску-2011». Канцэрт, прысвечаны юбілею Дзяржаўнага акадэмічнага рускага народнага хору імя М. Пятніцкага.
20.45 «Калыханка».
21.00, 22.55 «СССР — музыка пад забаронай». Леанід Уцёсаў.
21.25 «Вясёлая моладзь». Камедыя.
23.25 «Вій». Кінааповесць.

БЕЛАРУСЬ 5

7.00, 7.30, 23.45 PRO спорт. Навіны.
7.15 Козел пра футбол.
7.50, 13.55 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
10.05 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Матчы ў адказ. Агляд гульнявога дня.
10.35 Хакей. КХЛ. «Спартак» (Масква) — «Дынама» (Мінск).
12.30 Аўтаспорт. Velcom — чэмпіянат Беларусі па дрыфтынгу. Пяты этап. Брэст.
16.30 Спорт-кадр.
17.00 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Матч у адказ.
19.00 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
21.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Матчы ў адказ. Анлайн гульнявога дня.

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.15, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Фазэнда».
11.55 «Модны прыгавор».
13.10 «Мужчынскае/Жаночае».
14.10 Серыял «Дурная кроў».
16.20 «Вучыцца жыць».
16.50 «Давай пажэнімся!»
18.20 Серыял «Аднакласнікі».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Шулер».
23.05 Камедыя «Прабліскі надзеі».

1.10 Начныя навіны.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.25 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
8.30 Маст. фільм «Спяшайся кахаць».
10.20 «Далёкія сваякі».
10.40 Серыял «Салдаты 9».
11.30 «Сямейныя драмы».
12.30 «Не хлусі мне!».
13.50 «Ежа багоў».
14.45, 23.00 Серыял «Меч».
16.50 «Мінск і мінчане».
17.35 «Званая вячэра».
18.35 «Дакументальны праект»: «Бяссмерце супраць смерці».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Маст. фільм «Паралельныя светы».
21.55 «Глядзець усім!».
0.45 «Сакрэтныя тэрыторыі».

МІР

6.00 «180 хвілін».
9.00 «Зроблена ў СССР».
9.30, 2.35 Маст. фільм «Анкор, яшчэ Анкор!..»



11.10 Маст. фільм «Бацька».
13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Навіны (бягучы радок).
13.20, 1.40 «Давайце разбяромся!»
14.15, 4.15 Серыял «Мужчына ўва мне».
16.20, 0.45 Ток-шоу «Слова за слова».
17.15 Серыял «Маўклівы сведка».
19.25 Маст. фільм «Пазаземны».
21.25, 23.15 Серыял «Калыска над бездонню».
0.35 Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30, 0.35 Серыял «Вечны кліч».
13.50, 16.50, 19.50, 23.00 Навіны — Беларусь.
14.30 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.30 «Прамы эфір».
17.10 «Чалавек з планеты Кіндза-дза. Георгій Данелія».
18.00 Меладрама «Люба. Любоў».
Найчасцей людзі купляюць страхоўку ад нейкіх зразумелых і відавочных рэчаў. Напрыклад, страхоўка на выпадак ДТЗ, дома ад пажару, страты здароўя або жыцця. І ў выпадку, калі падзея адбылася — людзі ідуць у страхавую кампанію па выплату. Здавалася б, усё проста і зразумела, але часам кампаніям даводзіцца сутыкацца з вельмі незвычайнымі сітуацыямі.

Паўла Катэлі з Італіі застрахавала сваю дарагую вясельную сукенку ручной працы на выпадак, калі яна будзе скрадзена. На вяселлі яна так захапілася, што занадта блізка падышла да мангала для барбекю. Тканіна ўмомант успыхнула, але знаходлівы жаніх падхапіў нявесту і скокнуў з ёй з абрыву ў мора! Сукенка была безнадзейна сапсавана, і, хоць такога страхавога выпадку ў дагаворы не было, страхавая кампанія ўсё ж аплаціла 50% кошту сукенкі.

Адвакат з Паўночнай Караліны купіў скрынку дарагіх цыгар і застрахаваў іх літаральна ад усяго. Пасля таго, як цыгары былі выкураны, адвакат запатрабаваў кампенсацыі шкоды, матывуючы гэта тым, што цыгары пацярпелі ад пажару. Страхоўшчыкі плаціць адмовіліся, але юрыст выйграў суд, здолеўшы даказаць, што гэты страхавы выпадак не супярэчыць дагавору, і атрымаў 15 тысяч долараў. Аднак юрысты страхавой кампаніі аспрэчылі рашэнне суда на той падставе, што кліент наўмысна знішчыў застрахаваную маёмасць. За махлярства адвакат атрымаў 2 гады турмы і яшчэ выплаціў 24 тысячы долараў штрафу.

Купіўшы iPhone, фермер Айвар Бенет з Вялікабрытаніі адразу застрахаваў пакупку. Праз некаторы час смартфон перастаў працаваць, і фермер звярнуўся да страхоўшчыкаў. Высветлілася, што Бенет карыстаўся iPhone як ліхтарыкам, калі прымаў роды ў каровы, і ў працэсе смартфон нават паспеў пабываць унутры жывёлы. Страхавая кампанія выплаціла фермеру поўны кошт тэлефона, не знайшоўшы прычын для адмовы.

Яшчэ адзін грамадзянін ЗША звярнуўся да страхоўшчыкаў з заявай, у якой паведаміў, што з закрытага гаража скралі катар даўжынёй 30 футаў. Праўда, даўжыня гаража была ўсяго 24 футы, і 30-футавы катар проста там не памясціўся б. Махляр, які дрэнна вучыў матэматыку, атрымаў год умоўнага пакарання і выплаціў штраф.

Сямейная пара, падарожнічаючы ў джунглях Малайзіі, вырашыла адасобіцца ў намёце. Вопратку, якую яны пакінулі звонку, тут жа скралі малпы. У страхавой кампаніі, мабыць, доўга смяяліся, але шкоду кампенсавалі цалкам.

Першы аўтамабіль быў застрахаваны ў 1901 годзе. У той час аўтамабілі былі яшчэ зусім новым відам транспарту, таму ніякіх спецыяльных полісаў або ўмоў страхавання яшчэ не існавала. Уладальніку машыны выпісалі звычайны марскі поліс на падставе таго, што аўтамабіль — гэта карабель, які ажыццяўляе рух па сушы.

У жанчыны, якая адпачывала ў Анталі, не зусім атрымаўся адпачынак. У заяве страхоўшчыкам яна напісала наступнае: «Прашу вас кампенсаваць мне маральную шкоду, нанесеную заменай гатэля 3* з паўпансіёнам на 4* — усё ўключана. У выніку такога адпачынку я патаўсцела да непрыстойнасці і мяне кінуў муж». Ці была выплачана кампенсацыя і ці вярнуўся муж, невядома.

Іван КУПАРВАС. *hvir@zviazda.by*

ВТВ

6.00, 6.00 «PLAY».
7.30, 14.30 «Хатняя кухня».
8.00 «Ералаш».
9.00 Серыял «Супер Макс».
10.00, 1.00 «Турбаміксер».
12.00 Баявік «Таксі 4».
13.50 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
15.00, 5.00 Меладрама «Нявеста з запраўкі».
17.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
17.30 «Уральскія пельмені».
19.00 Серыял «Два бацькі і два сыны».
20.30 Баявік «Тэрмінатар 2: Судны дзень».
23.30 «Без вежы».
0.30, 4.00 «Лаві момант».
3.30 Скетч-шоу «ВалераТБ».
4.30 Скетч-шоу «6 кадраў».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.00 «Звычайны канцэрт».
10.30 «Матрос з «Каметы». Маст. фільм.
12.00 «Архімузей. Архітэктурныя музеі свету». Дак. фільм.
12.50 «Севастопальскія апавяданні. Падарожжа ў гісторыю з Ігарам Залатавіцкім». Дак. серыял. «Цана перамогі».
13.35 Канцэрт ансамбля танца «Шаратын».
14.25 «Сяргей Урсуляк. Дзіўная памяць непражытага жыцця». Дак. фільм.
15.05 «Доўгае развітанне». Маст. фільм.
16.55 «Аркестр са звалкі». Дак. фільм.
18.15 «Рамантыка раманса». Барысу Фаміну прысвячаецца...
19.15 «Нябесныя ластаўкі». Маст. фільм.
21.20 «Андрэй Міронаў. «Глядзіце, я іграю...» Дак. фільм.
22.00 100 гадоў з дня нараджэння Інгрыд Бергман. «Інтэрмеца». Маст. фільм.
23.30 З калекцыі тэлеканала «Культура». Вялікі джаз. Фінал.
1.55 «Шукальнікі». «Закінуты горад шаўковага шляху».
2.40 «Сусветныя скарбы культуры».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00 «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Генадзь Хазанаў.
6.40, 8.15, 9.40, 11.00, 11.40, 14.20, 15.40, 17.00, 17.35, 20.15, 20.45, 23.05, 0.45, 2.25, 3.40, 5.00, 5.40 Музычная настальгія.
7.00 Маст. фільм «Кожны дзень жыцця».
8.45 М/ф «Жураўлік».
9.00, 15.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00, 4.00 «Народжаныя ў СССР».
11.30, 17.30, 5.30 «Сядзі і глядзі». 2005 год.
12.00, 18.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1976. Паўтор ад 2009 года.
13.15 Маст. фільм «У адно адзінае жыццё».
14.40 М/ф «Як казакі алімпійцамі сталі».
16.00 «Колба часу».
19.20 Канцэрт групы «Аліса». 1988 год.
20.30 М/с «Болек і Лёлек на канікулах».
21.00 «Быў час». 2009 год.
22.00 Маст. фільм «Падарунак лёсу».
0.00 «Тэатральны раман». Маскоўскія тэатры ў 1980-я гады.
1.10 Маст. фільм «Між высокіх хлябоў».
2.45 М/ф «Як казакі кулеш варылі».

EUROSPORT

4.00, 13.00, 19.00, 21.00, 1.00 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
12.45, 16.15 Лёгкая атлетыка. Грын лайт.
16.30, 17.00, 20.00, 22.30 Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі.
16.45, 18.45 Веласпорт.
23.30 Ралі. ERC Чэхія.
0.00 Тэніс. Турнір Вялікага Шлема. Адкрыты Чэмпіянат Францыі.

КАМЕДЫЯ

6.00, 9.50 Серыял «Месяцовы хлопчык».
6.50 Камедыя «Ох, ужо гэты адпачынак».
8.20 Камедыя «Зануда».
10.40 Прыгоды «Астэрыкс і Абелікс у Брытаніі 3D».
12.30 Камедыя «Няўдачлівыя».
14.00, 0.55, 5.40 Скетчком «Паміж намі».
14.20 Камедыя «Здзелка».
16.00 Камедыя «Горка».
17.40, 22.00 Серыял «Вялікая школа».
18.40 Камедыя «Два з паловай жулікі».
20.20 Камедыя «Сямейны план».
23.10 Камедыя «Пенелопа».
1.15 Камедыя «Востраў скарбаў».
3.00 Серыял «Татуся».
4.00 Камедыя «І не чырванее».

ТБ3

6.00 М/ф.
9.50, 5.15 «Нераскрытыя тайны».
10.45 «Ргокіно».
10.55 «Хронікі маскоўскага побыту».
11.45 «Гісторыі выратавання».
12.20, 0.40 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
16.05 М/ф «Рыа».
17.35, 3.55 Дак. фільм «Юрый Антонаў. Мары збываюцца і не збываюцца».
19.15 Маст. фільм «Спячы і Прыгажуня».
21.10 Маст. фільм «Барвовыя рэкі».
23.10 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

ТБ1000

6.50 Драма «12 гадоў рабства».
9.10 Драма «Перапыненае жыццё».
11.30, 1.00 Драма «Блізкасць».
13.20 Драма «Мажэсцік».
16.00 Меладрама «Да цуду».
18.00 Камедыя «Як страціць сяброў і прымусіць усіх цябе ненавідзець».
20.00 Меладрама «Шоўк».
21.50 Трылер «Стоўн».
23.35 Драма «Апошняе каханне на Зямлі».
2.40 Меладрама «Здзелка».
4.20 Драма «Прэстыж».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Камедыя «Бакенбарды».

8.20 Драма «Балада пра бомбер».
11.40 Драма «Гутарка».
13.10, 4.10 Камедыя «Дэжа вю».
15.05 Меладрама «Яшчэ адзін год».
17.00 Баявік «22 хвіліны».
18.30 Фантастыка «Паляўнічы».
20.20 Баявік «Населены востраў. Фільм першы».
22.30 Камедыя «Усё ўключана 2».
0.20 Баявік «Васьмёрка».
2.00 Трагікамедыя «Зусім не простая гісторыя».
4.10 Камедыя «Дэжа вю».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Скарбашукальнікі.
6.50, 8.05 Навуковыя недарэчнасці.
7.15 Зрабі або памры.
8.30 Картачны фокуснік.
9.20 Навука будучыні.
10.10 Гульні розуму.
10.35, 18.30 Гульня ў лікі.
11.00 Космас: Прастора і час.
11.50, 20.10 Мегазаводы.
12.40 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
13.30 Супербудаванні Трэцяга рэйха.
14.20 Дзікая прырода Расіі.
15.10 Тайнае жыццё драпежнікаў.
16.00 Расійскія сакрэтныя матэрыялы.
16.50 Калі паглыне Зямля Вас.
17.40 Тайвань: востраў рыбы.
19.20 Кіраванне натоўпам.
21.00, 0.20, 3.40 Больш, чым тыраназаўр.
21.50, 1.10, 4.30 Тыраназаўр: чэмпіён па выжыванні.
22.40, 2.00, 5.15 Зямля з космасу.
23.30, 2.50 Лавец камет.

DISCOVERY

8.00, 17.10, 5.36 Вулічныя гонкі.
8.50, 15.30 Хуткія і гучныя.
9.40, 16.20, 6.24 Калекцыянеры аўто.
10.30 Дарожныя каўбоі.
11.20 Смяротны ўлоў.
12.10 Ледзяное золата.
13.00, 4.00 Іржавая імперыя.
13.50 Склады.
14.40 Што ў вас у гаражы?
18.00 Ванная пад ключ.
18.50 Майстар па стварэнні басейнаў.
19.40 Акварыумны бізнес.
20.30 Кубінская акула.
21.20 Акулы-ніндзя.
22.10 Монстр Мако.
23.00 Нявеста са сківіцамі.
23.50 Вяртанне белай забойцы.
0.40 Выратаванне з пашчы.
1.30 Акулы з царства ценяў.
2.20 Перш за ўсё.
3.10 Інжынерныя пралікі.
4.48 Як гэта ўстроена?
5.12 Як гэта зроблена?
7.12 Цяпер ірване.

ХТОСЬЦІ МАРЫЦЬ ПРА МІНАС ЦІРЫТ...

Толкіен са сваім «Уладаром кольцаў» (у тым ліку дзякуючы рэжысёру Пітэру Джэксану) захапіў розумы многіх людзей, а брытанцаў асабліва. Адной з праяў гэтага стала новая фантастычная ідэя брытанскіх архітэктараў, якія запусцілі праз інтэрнэт-платформу Indiegogo краўдфандынгавую* кампанію, разлічваючы сабраць 1 мільярд 850 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў на будаўніцтва выдуманага горада Мінас Цірыт — сталіцы Гондара ў легендарнай трылогіі.

Поўнапамерную копію горада-крэпасці плануецца ўзвесці на пагорках на поўдні Англіі. Калі цягам двух месяцаў праект збярэ патрэбную суму, тыя з прыхільнікаў Толкіена, хто далучыўся да фінансавай падтрымкі будоўлі, змогуць атрымаць у горадзе сваёй мары жыллё або працу.

Грошы, якія застануцца пасля завяршэння будоўлі (плануецца, што гэта адбудзецца ў 2023 годзе), будуць накіраваны на тэхнічнае абслугоўванне і грамадскія патрэбы горада да 2053 года. Будаўніцтва плануецца пачаць ужо напрыканцы 2016 года. Аўтары праекта ўпэўнены, што змогуць стварыць не толькі самую дзівосную турыстычную славутасць у свеце, але і цудоўнае і ўнікальнае месца для жыцця і працы.

...А ХТОСЬЦІ ЎЖО ВЫКАПАЎ НАРУ ХОБІТА

А вось сямейная пара з Вялікабрытаніі вырашыла пачаць падарожжа ў свет Толкіена з малога і пабудавала ў мястэчку Лівертан (графства Паўночны Ёркшыр) гасцініцу па ўзоры нары хобітаў. На ўзвядзенне гатэля спатрэбілася 15 тысяч фунтаў.

Паводле слоў уладальнікаў нерухомасці Кэрал Гопкінсан і Карла Рага, знешні выгляд катэджа яны імкнуліся максімальна наблізіць да нораў, якія паказаны ў кінасагах «Уладар кольцаў» і «Хобіт». Муж і жонка адзначылі, што вырашылі пабудаваць незвычайны дом дзеля сваіх пяцярых дзяцей — Холі, Розі, Чарлі, Дэйзі і Попі. У гатэлі ёсць утульныя кухні з усім неабходным «начыннем», гасцёўня, печка, ванна на ножках і шэсць спальных месцаў. Дзверы і вокны ў нары круглыя, а дзвярныя ручкі размяшчаюцца пасярэдзіне, як у селішчах хобітаў, прыдуманых Толкіенам. «Мы рады адкрыць нару. Тут сем'і змогуць атрымаць асалоду ад цудоўных навакольных краявідаў і павесяліцца як след», — адзначыла Кэрал Гопкінсан. Уласніца гасцініцы таксама заявіла, што ў будучыні на базе гатэля плануецца арганізаваць навучанне дзяцей турызму, асновам бізнесу, а таксама садовай справе.

Тры дні знаходжання ў нары хобітаў абыдуцца турыстам у 650 фунтаў, тыдзень — у 850 фунтаў, 14 дзён — у 1450 фунтаў.

* *краўдфандынг — калектыўнае супрацоўніцтва людзей, якія добраахвотна аб'ядноўваюць свае грошы ці іншыя рэсурсы (як правіла, праз інтэрнэт), каб падтрымаць намаганні іншых людзей або арганізацый.*

НЯДЗЕЛЯ, 30 ЖНІЎНЯ

БЕЛАРУСЬ 1

5.35 Камедыя «Тата напракат». 1-я — 4-я серыі.
9.00, 12.00, 15.00 Навіны.
9.10 «Арсенал».
9.40, 1.00 Серыял «Два бацькі і два сыны».
10.45 «50 рэцэптаў першага».
11.25 XXL WOMAN TV.
12.10 Навіны. Цэнтральны рэгіён.
12.35 Зона Х. Вынікі тыдня.
13.05 Вялікі рэпартаж.
13.40 Каробка перадач.
14.10 Вакол планеты.
15.15 Твой горад.
15.30 Камедыя «Канікулы строгага рэжыму».
17.35 Меладрама «Шчаслівы шанц». 1-я і 2-я серыі.
21.00 Галоўны эфір.
22.15 Клуб рэдактараў.
22.50 Навіны надвор'я.
23.15 Меладрама «З чыстага ліста».

БЕЛАРУСЬ 2

7.05 М/с «Клуб Вінкс. Школа чараўніц».
8.50, 21.45 Серыял «Шчаслівыя разам».
10.30 Я хачу гэта ўбачыць!
11.05, 23.25 Хачу ў тэлевізар!
11.15, 20.05 Тэлебарометр.
11.20 Ваша лато.
11.50 Латарэя «Пяцёрачка».
12.00 «Зразумець і абясшкодзіць».
12.30 Серыял «Мая цудоўная нянька».
14.35 «Арол і рэшка. Шопінг».
15.35 Камедыя «Аднакласнікі 2».
17.20 Баявік «Фантастычная чацвёрка: Уварванне сэбнага сёрфера».

19.15 Суперлато.
20.40 Кіпень.
21.00 Мазгавы штурм.
21.40 Спортлато 5 з 36, КЕНО.
23.30 «Разбуральнікі міфаў».

БЕЛАРУСЬ 3

8.00, 13.15, 19.05, 23.40 «Калейдаскоп».
8.10 «31 чэрвеня». Мюзікл. 1-я і 2-я серыі.
10.20 Бард International.
11.55 «Наперад у мінулае».
12.25, 21.05 Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
13.25, 22.00 «Прастадушны». Камедыя.
15.10 «Грані Перамогі». Парады Перамогі.
15.40 «Музеі Беларусі». Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.
16.35 «Сны Сафіі Снесаравай». Дак. фільм.
17.15 «Чорны цюльпан». Прыгоды.
19.15 «Зямля Саннікава». Прыгоды.
20.45 «Калыханка».

БЕЛАРУСЬ 5

7.15, 7.50, 1.00 PRO спорт. Навіны.
7.30 Спорт-мікс.
8.10 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Тотэнхэм» — «Эвертан».
10.05 Гандбол. SEHA-ліга. «БГК імя Мяшкова» — «Спартак» (Славакія).
11.35 Тэніс. Турнір WTA. Ньюпорт. Хэйвен. Фінал.
13.25, 23.25 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
15.55 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
16.30 Авертайм. КХЛ.
17.00 Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — «Дынама» (Рыга).
19.40 Хакей. Ліга чэмпіёнаў. «Нёман» (Гродна, Беларусь) — «Віткавіцэ» (Чэхія).
21.35 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Суёнсі» — «Манчэстэр Юнайтэд».

АНТ

7.00 «Нядзельная раніца».
8.00, 9.00, 16.00 Нашы навіны.
9.05 «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
9.20 М/с «Смяшарыкі. ПІНкод».
9.35 «Бесталковыя нататкі».
9.55 «Пакуль усе дома».
10.40 «Фазэнда».
11.15 «Ідэальны рамонт».
12.25 Маст. фільм «Пакуль шалее мара».
13.55 Маст. фільм «Анёл у сэрцы».
16.15 Навіны спорту.
16.20 «Фаіна Ранеўская. Прыгажосць — страшная сіла».
17.20 «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Юбілейны выпуск.
20.00 Контуры.
21.05 «Аффтар жжот».
22.10 Маст. фільм «Іншы мужчына».
23.50 Маст. фільм «Праўдзівая хлусня».

СТБ

6.40 Серыял «Афрамасквіч».
7.30 «Скардзіцца дазваляецца».
7.50 Маст. фільм «Банкаўскі білет у мільён фунтаў стэрлінгаў».
9.20 «Дакументальны праект»: «Тайна бермудскага трохвугольніка».
10.15 «Чыстая праца».
11.00 «Вялікае снеданне».
11.40 Серыял «Салдаты 4». Заключная серыя.
12.35 Серыял «Салдаты 5».
13.30, 16.30 «24 гадзіны».
13.40, 0.25 Маст. фільм «Уцекачы».
15.20 «Вадзіць па-руску».
16.00 «Цэнтральны рэгіён».
16.50 «Тайны нашай планеты»: «Космас. Ключ да разгадкі».

17.45 «Ваенная тайна».
19.30 «Тыдзень».
20.25 Маст. фільм «Тайна ў яго вачах».
22.40 «Званая вячэра». Самыя яркія тыдні.
1.55 «Масква. Дзень і ноч».

МІР

6.15 М/ф.
7.25 Маст. фільм «Вас чакае грамадзянка Ніканорава».
9.05 «Ведаем рускую».
10.00, 16.00 Навіны (бягучы радок).
10.15 «Чаму я?».
10.45 Серыял «Пачаць спачатку. Марта».
14.15 Маст. фільм «Сямейка вампіраў».
16.15 «Культасвета. Інтэрв'ю. С. Бязрукаў».
16.30, 23.00 Серыял «Чорныя ваўкі».
21.00 «Разам».
1.00 Маст. фільм «Мадэмуазель Мушкецёр».
4.05 Маст. фільм «Цырк».

РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «ХА». Маленькія камедыі.
7.35 Маст. фільм «З каханымі не расстаюцца».
11.00, 14.00, 20.00 Весткі.
11.15 «Сам сабе рэжысёр».
12.05 «Смехапанарама».
12.40 «Ранішняя пошта».
13.20 М/ф.
14.15 «Кулінарная зорка».
15.10 Міжнародны конкурс дзіцячай песні «Новая хваля-2015».
16.20 Фестываль дзіцячай мастацкай гімнастыкі «АЛІНА».
18.00, 22.00 Маст. фільм «Акула».
21.00 Ток-шоу «Што адбываецца».

НТБ—БЕЛАРУСЬ

5.55, 8.20 Серыял «Шлюбны кантракт».
8.00, 10.00, 13.00, 16.00 Сёння.
8.55 «Добра там, дзе мы ёсць!».
9.25 «Ядзім дома».
10.25 «Першая перадача».
11.00 «Цуд тэхнікі».
11.50 «Дачны адказ».
13.20 «Уласны гонар».
14.15, 16.20 Серыял «Люстасць».
18.05 «Следства вялі».
19.00 «Акцэнты тыдня».
19.35 Маст. фільм «Доктар смерць».
23.10 «Жыццё як песня. Мікалай Трубач».
0.15 «Справа цёмная».

8 КАНАЛ

9.00, 14.55, 19.00, 23.15 «Надвор'е».
9.05 Мультпарад.
10.00 «Адшукваецца адпачынак».
10.30, 14.45, 16.30, 20.55 «Хатняя крама».
10.45 Трылер «Сакрэтныя матэрыялы. Хачу верыць».
12.35 Камедыя «Пол. Сакрэтны матэрыяльчык».
14.30 «Кінаблакнот».
15.00 М/ф.
16.35 Серыял «Каломба».
18.00 «Хобі + TV». «Свой фермер».
19.05 Меладрама «Паміж небам і зямлёй».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «Неверагодная магія».
21.10 Камедыя «За бортам».
23.20 «Хобі + TV».

ВТВ

6.00, 6.00 «PLAY».
8.00 «Ералаш».
9.00 Серыял «Супер Макс».
10.00, 1.00 «Турбаміксер».
12.00 Серыял «Два бацькі і два сыны».
13.30 «Паспець за 24 гадзіны».
14.30 «Рублёва—Бірулёва».
15.30 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
16.00 Баявік «Тэрмінатар 2: Судны дзень».
19.00 «Уральскія пельмені».
20.30 Баявік «Вяртанне героя».
22.45 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
23.30 «Без вежы».
0.30, 4.00 «Лаві момант».
3.30 Скетч-шоу «Валера-ТБ».
4.30 Скетч-шоу «6 кадраў».
5.00 Меладрама «Нявеста з запраўкі».

КУЛЬТУРА

6.30 «Еўраньюс».
10.10 «Нябесныя ластаўкі». Маст. фільм.
12.20 «Севастопальскія апавяданні. Падарожжа ў гісторыю з Ігарам Залатавіцкім». Дак. серыял. «Пад грыфам «Сакрэтна».
13.05 Краіна птушак. «Вароны вялікага горада».
13.55 Геніі і злодзеі. Мікалай Пуцілаў.
14.25 Фальклорны фестываль «Уся Расія».
15.40 «Пешшу...» Масква Шэхцеля.
16.10 «Данатас Баніёніс». Дак. фільм.
16.50 «Мёртвы сезон». Маст. фільм.
19.05, 1.55 «Шукальнікі». «Блакадны матч».
19.55 Хрустальны баль «Хрустальнай Турандот». Марк Захараў.
21.10 «Матрос з «Каметы». Маст. фільм.
22.45 З калекцыі тэлеканала «Культура». Вялікая опера-2014.
0.35 «Гісторыя футбола». Дак. фільм.
1.30 «Шэрлак Холмс і доктар Ватсан». «Па-за гульнёй». М/ф для дарослых.
2.40 «Сусветныя скарбы культуры».

НАСТАЛЬГІЯ

6.00, 12.00 «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1976. Паўтор ад 2009 года.
7.15 Маст. фільм «У адно адзінае жыццё».
8.20, 9.40, 11.00, 11.35, 14.15, 14.45, 17.05, 18.45, 19.55, 20.55, 23.15, 0.40, 2.15, 3.40, 5.00, 5.40 Музычная настальгія.
8.40 М/ф «Як казакі алімпійцамі сталі».
9.00, 3.00 «Мінулы час».
10.00 «Колба часу».
11.30, 5.30 «Сядзі і глядзі». 2005 год.
13.20 Канцэрт групы «Аліса». 1988 год.
14.30 М/с «Болек і Лёлек на канікулах».
15.00 «Быў час». 2009 год.
16.00 Маст. фільм «Падарунак лёсу».
18.00 «Акулы пяра». Барыс Грабеншчыкоў. 1995 год.
19.00 «Усё будзе так, як мы хочам!» VI Ленінградскі рок-фестываль. 1989 год.
20.30 М/с «Болек і Лёлек — шукальнікі прыгод».
22.00 Маст. фільм «Бывайце, фараоны...»
0.00 «Гэта было нядаўна, гэта было даўно... Тэлевізійныя мемуары». Генадзь Хазанаў.
1.00 Маст. фільм «Кожны дзень жыцця».
2.45 М/ф «Жураўлік».
4.00 «Народжаныя ў СССР».

EUROSPORT

4.00, 6.30, 8.30, 11.30, 13.15, 21.00 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат свету.
5.00, 10.15, 15.45, 17.00, 20.15, 22.30 Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі.
8.15, 13.00, 15.30 Лёгкая атлетыка. Грын лайт.
9.45, 23.15 Ралі. ERC Чэхія.
16.45, 18.45 Веласпорт.
19.00 Аўтагонкі. Чэмпіянат свету па эндуранс.
23.45 Аўта- і мотаспорт.
0.00 Футбол. Старэйшая ліга футбола. «Seattle Sounders FC» (ЗША) — «Portland Timbers» (ЗША).
2.00 Футбол. Старэйшая ліга футбола. «Нью-Ёрк Рэд Булз» (ЗША) — «Дзі Сі Юнайтэд» (ЗША).

КАМЕДЫЯ

6.00, 9.50, 3.05 Серыял «Месяцовы хлопчык».
6.50 Камедыя «Зануда».
8.20 Камедыя «Няўдачлівыя».
10.40 Камедыя «Горка».
12.20 Камедыя «Два з паловай жулікі».
14.00, 0.55, 5.40 Скетчком «Паміж намі».
14.20 Камедыя «Круты татачка».
16.00 Камедыя «Пенелопа».
17.45, 22.00 Серыял «Вялікая школа».
18.45 Камедыя «Сямейны план».
20.20 Камедыя «Кактус».
23.10 Камедыя «Вайна гузікаў».
1.15 Прыгоды «Астэрыкс і Абелікс у Брытаніі 3D».
4.00 Камедыя «Востраў скарбаў».

ТБ3

6.00 М/ф.
10.20, 5.15 «Нераскрытыя тайны».
11.15 «Паненка і кулінар».
11.50, 1.40 Серыял «Каменская».
15.15 «Сто пытанняў даросламу».
16.05 «Жонка. Гісторыя кахання».
17.25 «Без падману».
18.15 Дак. фільм «Крывавы спорт».
19.55, 4.35 «Доказ віны».
20.45 Маст. фільм «Заганная страсць».
22.45 «Асцярожна, махляры!».
23.15 «Часова даступны».
0.10 Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».

ТБ1000

6.30 Меладрама «Шоўк».
8.20 Драма «Блізкасць».
10.00 Камедыя «Давай, да пабачэння!».
11.30, 1.10 Трылер «Анёлы і Дэманы».
13.50 Фантастыка «Дывергент».
16.10 Драма «Джобс: Імперыя спакусы».
18.15 Камедыя «Радаснае падзея».
20.00 Драма «Магія слоў: Гісторыя Дж.К. Роўлінг».
21.30 Трылер «Ілюзія падмана».
23.30 Драма «Добрай ночы, Месяц».
3.45 Драма «Гавана, я люблю цябе».

ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

6.20 Драма «Палёты ў сне і наяве».
8.00 Драма «Масква».
10.30 Меладрама «Паралельныя светы».
12.05 Камедыя «Пра што маўчаць дзяўчыны».
13.40 Драма «Ваенна-палявы раман».
15.20 Драма «Клас карэкцыі».
17.00 Камедыя «Карпаратыў».
18.30 Камедыя «Усё ўключана 2».
20.20 Баявік «Населены востраў: сутычка».
22.15 Драма «Гагарын: першы ў космасе».
0.20 Камедыя «Вясёлая моладзь».
2.05 Фантастыка «Паляўнічы».

NATIONAL GEOGRAPHIC

6.00 Скарбашукальнікі.
6.50, 8.05 Навуковыя недарэчнасці.
7.15 Зрабі або памры.
8.30 Тайвань: востраў рыбы.
9.20 Навука будучыні.
10.10 Гульні розуму.
10.35, 18.30 Гульня ў лікі.
11.00 Космас: Прастора і час.
11.50, 20.10 Мегазаводы.
12.40 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
13.30 Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
14.20 Дзікая прырода Расіі.
15.10 Тайнае жыццё драпежнікаў.
16.00 Тайны Стафардшырскага скарбу.
16.50 Грашовае сховішча ЗША.
17.40 У пошуках Атлантыды.
19.20 Кіраванне натоўпам.
21.00, 0.20, 3.40 90-я: дзесяцігоддзе, якое нас аб'яднала.
21.50, 1.10, 4.30 80-я: дзесяцігоддзе, якое стварыла нас.
22.40, 2.00, 5.15 Віні Джонс: Рэальна пра Расію.

DISCOVERY

8.00 Іржавая імперыя.
8.50 Што ў вас у гаражы?
9.40 Склады.
10.30, 4.00 Акула з цемры.
11.20 Інжынерныя пралікі.
12.10 Выжыванне без купюр.
13.00, 3.10 Выжыць разам.
13.50 Акварыумны бізнес.
14.40 Майстар па стварэнні басейнаў.
15.30, 22.10 Катастрофа на колах.
16.20, 23.00 Разбуральнікі легенд.
17.10, 23.50 Цяпер ірване.
18.00, 5.36 Сківіцы, якія лётаюць.
18.50, 6.24 Сківіцы наносяць удар у адказ.
19.40, 7.12 Гаваі: страчаны рай.
20.30 Ледзяное золата.
21.20 Дарожныя каўбоі.
0.40 Апетыты вялікай белай.
1.30 Акулавае сямейства.
2.20 Смяротны ўлоў.
4.00 Акула з цемры.
4.48 Як гэта ўстроена?
5.12 Як гэта зроблена?

■ Віцебская школа

ЯКІМ БЫЎ DOS?

Успаміны з творчай суполкі «Квадрат»

Сёлета спаўняецца 95 гадоў створанаму Казімірам Малевічам УНОВІСу. Умацавальнікам Новага Мастацтва (Утвердителям Нового Искусства, ад чаго і назва), што, адмятаючы рэалізм, здзіўлялі сучаснікаў у паслярэвалюцыйныя гады сваімі творчымі эксперыментамі. Віцебскае нефармальнае творчае аб'яднанне «Квадрат», арганізаванае ў сярэдзіне 1980-х гадоў, працягвала традыцыі першых авангардыстаў. Адным з яго аўтараў быў стваральнік канцэпцыі ПЛІП Аляксандр ДАСУЖАЎ, ці проста — DOS. Першымі літарамі свайго прозвішча ён падпісваў палотны, так часам да яго звярталіся сябры... Летась Аляксандр Ігаравіч пайшоў з жыцця, а сёлета — 31 кастрычніка — яму споўнілася б 70 гадоў. Карэспандэнт «Звязды» сустрэўся з сябрам Аляксандра Дасужава, вядомым мастаком, уладальнікам папулярнага віцебскага салона-галерэі «Сцяна» Мікалаем ДУНДЗІНЫМ.

Адна з апошніх сустрэч Аляксандра ДАСУЖАВА *(злева)* і Мікалая ДУНДЗІНА.

«А МНЕ ТАК ЗАХАЦЕЛАСЯ»

У Віцебску Аляксандр Дасужаў, ураджэнец вёскі Пухавічы Мінскай вобласці, як цяпер бы сказалі, быў крэатыўным студэнтам.

— Саша быў на пяць гадоў старэйшы за мяне. Я паступіў на мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута (сёння гэта дзяржаўны ўніверсітэт. — **Аўт.**) у 1968 годзе, а ён у гэты час ужо працаваў над дыпломам. У адрозненне ад мяне Саша з аднакурснікамі ўжо цвёрда стаялі на нагах, мелі за плячыма службу ў арміі. Я быў, лічыце, «пацаном», а яны — мужчынамі, з жыццёвым вопытам і прынцыпамі, — распавядае Мікалай Мікалаевіч. — У «мастграфе» сярод іншых выкладалі малады Гумен (мэтр акварэлі, які і цяпер поўны сіл), графік Клікушын (аўтар шрыфтоў), у будучыні «гуру» дзясяткаў віцебскіх акварэлістаў Сталяроў... Курс кожнага з іх і наогул факультэт былі моцнай школай. Разам з тым студэнты самастойна вывучалі класічнае мастацтва, адкрывалі для сябе Пікаса, Далі, ды і Шагала. Я, дарэчы, не ведаў, хто такі Шагал. Рэцэнзент, калі ўбачыў мой дыпломны твор «Сузор'е знакаў Задыяка», запытаўся: «А вы выпадкова не яўрэй? Вельмі падобна да Шагала...» А я: «А хто ён такі?» Саша, упэўнены, ведаў, і не толькі Шагала. Ён даставаў замежныя часопісы пра мастацтва, любіў фільмы Таркоўскага і Феліні, цытаваў вершы нейкага грэка... Яшчэ студэнтам ён пачаў выпрацоўваць аўтарскі стыль і дарослым эксперыментаваў, шукаў «разыначку» нават у нацюрмортах. На адной выставе вядомыя майстры традыцыйнай школы пахвалілі яго пейзаж. «Але чаму ў небе лётае хустка ці што там?» — запыталіся. Ён патлумачыў, што хацеў надаць нейкае адчуванне палёту. «Дык напісаў бы воблака!» — кажуць. Саша ў адказ: «А мне так захацелася!»

З МАГІЛЫ ВЫСОЦКАГА — СА СТОМЛЕНЫМІ ВАЧЫМА...

— Творчы саюз існаваў і да афіцыйнага стварэння «Квадрата». У склепе аднаго дома знаходзілася некалькі майстэрняў — Аляксандра, будучага лідара «Квадрата» Малея, скульптара Слепава і мая. Да нас у госці заходзілі знаёмыя мастакі. Зразумела, і выпівалі, напрыклад, у Сашы збіраліся на французскі абед: на стале батон і французскае віно. Мерапрыемства плаўна перацякала ў вячэру, падчас якой мы вялі класныя размовы, спрачаліся, чыталі вершы і пісалі. У гэтыя моманты нараджалася шмат крэатыўных ідэй... У нас тады было ўзаемнае пачуццё любові, дружбы, адданасці. Гэта і перарасло ў «Квадрат», — не прафесійны саюз, а, хутчэй, духоўнае братэрства. Тут усё было грунтоўна, акрамя гадавога плана выставачнай дзейнасці. Ён для кожнага быў індывідуальны. Кантралявалі адзін аднаго, каб некаторыя раптам «не загулялі». Раслі творча... «Квадрат» праіснаваў сем гадоў — гэта даволі шмат. Аналагі з'яўляліся і самараспускаліся, а «Квадрат» жыў, — успамінае Мікалай Дундзін.



Палатно Аляксандра ДАСУЖАВА ПЛІП 45 «Дарога да зімы».

Сам Мікалай быў адказным сакратаром суполкі. З гумарам успамінае, што самым цяжкім было... збіраць узносы, па 10 рублёў у месяц у «агульную касу». Для параўнання: квіток у кіно каштаваў 25 капеек. «Казну» трацілі на сумесныя праекты, друк плакатаў і анонсаў выстаў, паездкі ў Піцер, Маскву, Каўнас...

— У Піцеры пазнаёміліся з удавой і дачкой Казіміра Малевіча — Наталляй Андрэеўнай і Уна-Ганнай. Першая незадоўга да сваёй смерці прыслала нам тэлеграму, дзе віншавала з выставай, прысвечанай 110-гадоваму юбілею з дня нараджэння Малевіча. Дзякуючы гэтаму знаёмству ў Віцебску стала больш інфармацыі пра часы УНОВІСа. І з «Міцькамі» (група творчых людзей, у першую чаргу мастакоў. — **Аўт.**) пасябравалі, як і з многімі цяпер вядомымі кампазітарамі, паэтамі. У Маскве было не менш цікава. Неяк на пачатку вячэры Аляксандр знік. Раніцай вяртаецца са стомленымі вачыма, «шэрым» тварам і кажа, што ўвесь час быў... ля магілы Высоцкага.

ТАКІ СУРАЗМОЎЦА — ЗНАХОДКА

— DOS умеў сябраваць. Камунікаваў з кампазітарамі, акцёрамі, паэтамі і далёкімі ад творчасці асобамі. Ён мог паехаць да некага ноччу, каб проста пасядзець побач. Чаго таіцца: і каб выпіць чарку, калі сябру дрэнна на душы. Аляксандр быў вельмі прыгожым унутры і знешне, разумна гаварыў і ўмеў слухаць. Такі суразмоўца — знаходка. Не дзіўна, што вельмі падабаўся жанчынам. І сам іх кахаў... Ён насіў з сабой запісную кніжачку. Тут былі не вершы, а нейкія фразы, разважанні, назіранні. Напрыклад: «Шагал шагал, шагал и до Парижа дошагал...» Рабіў запісы па тэме сваёй канцэпцыі ПЛІП. Ён доўга думаў і спыніўся на паверхні з лініяй і плоскасцю.

Блізкія Аляксандра Ігаравіча цяпер жывуць у Санкт-Пецярбургу. Сын многаму ў яго навучыўся і таксама займаецца творчасцю. Дачка — інжынер, ее сын — супрацоўнік ваенна-гістарычнага музея. Спадар Дундзін — яго хросны...

Незадоўга да смерці Аляксандр Дасужаў перамог у абласным адборы конкурсу арт-праекта «Zabor». Гэта апошняе творчае дасягненне, якіх у яго было шмат. Творы DOSa былі прадстаўлены на выставах у Германіі, Латвіі, Расіі, Польшчы, Іспаніі і іншых краінах. Палотны знаходзяцца ў многіх прыватных калекцыях і музеях. Рэпрадукцыі яго твораў увайшлі ў выданне «Беларускі авангард 1980-х».

Памёр раптоўна. Пайшоў у краму, стала дрэнна. У Мікалая Дундзіна ёсць партрэт, напісаны сябрам, ПЛІПы, фотаздымкі і запісы тэлевізійных рэпартажаў, прысвечаных «Квадрату». Сярод здымкаў — фрагменты роспісу фасада дома па эскізе Умацавальнікаў Новага Мастацтва... Аляксандр Дасужаў стаў адной з самых яскравых зорак «новага» беларускага авангарду. Як адзначыў адзін з сяброў мастака, DOS — у творчай камандзіроўцы. Адкуль вяртаецца кожны раз, калі глядзіш на яго фота і творы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

■ Культпаход

СЕЗОН МАР, або З чаго пачынаюць тэатры?

Ёсць людзі, якія не стануць засмучацца блізкім заканчэннем лета: ва ўсім ёсць сваё станоўчае, яго варта толькі ўбачыць. І мы ўбачылі — афішы, якія сведчаць пра пачатак сезона ў тэатрах краіны. Прычым, некаторыя не сталі чакаць восені, адчыніўшы свае дзверы ўжо ў жніўні. І ў гэтым ёсць рацыя: людзі вяртаюцца з адпачынкаў, але яшчэ апошнія летнія вечары хочуць правесці прыемна, культурна і з карысцю.

Першыя, хто разумее культурны запыт тэатралаў, — нацыянальныя тэатры. Напрыклад, **Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Янкі Купалы** свой 95-ты сезон адкрывае 25 жніўня. Для Купалаўскага шмат гадоў — нават дзесяцігоддзяў — не было выбару, які спектакль ставіць у афішы новага сезона першым. Адноўленая «Паўлінка» Янкі Купалы была спектаклем адкрыцця тэатра пасля рамонту (яна будзе, але ўжо ў верасні). Жыццё ў родных сценах найперш вымагае ад тэатра галоўнага — дыялогу з сучасным гледачом, які прыходзіць сюды не толькі дзеля разняволення, але яшчэ і па адказы на некаторыя пытанні, што ўзніклі не сёння і не цяпер у жыхароў менавіта нашай краіны. Адказы — у нацыянальнай драматургіі. І не толькі купалаўскай. Напрыклад, у «Пінскай шляхце» Вінсэнта Дуніна-Марцінкевіча, пастаўленай Мікалаем Пінігіным. Хто яшчэ не паглядзеў? Самы час для гэтага спектакля, жанр якога вызначаны як фарс-вадэвіль. У сённяшняй грамадскай сітуацыі ёсць нагода паразважаць пра Беларусь і магчымасці для яе развіцця. І яшчэ пра Беларусь з гісторыяй і асобамі: на наступны дзень, 26 жніўня, — «Чорная панна Нясвіжа» паводле Аляксея Дударава ў пастаноўцы Валерыя Раеўскага. З нацыянальнай тэмы на пачатку лета яшчэ «Людзі на балоце»(спектакль Аляксандра Гарцуева паводле Івана Мележа). І вядома, што без адной з самых абмяркоўваемых прэм'ер канца мінулага сезона не абышлося: чэхаўская «Чайка» ў інтэрпрэтацыі Мікалая Пінігіна ў жніўні прылятае на Купалаўскую сцэну двойчы.

Для Купалаўскага шмат гадоў — нават дзесяцігоддзяў — не было выбару, які спектакль ставіць у афішы новага сезона першым.

Нацыянальны акадэмічны рускі драматычны тэатр імя М. Горкага таксама пачаў сезон з прэм'еры. Праўда, тут пануе сусветная класіка. Сезон адкрыў на гэтым тыдні спектакль «Кола кахання» паводле Самерсэта Моэма (пастаноўка Мадэста Абрамава). Потым пайшлі камедыі «Утаймаванне свавольніцы» паводле Шэкспіра і «Злоўлены сеткай» паводле Рэя Куні, усе пастаноўкі Валянціны Ераньковай, таксама як і «Жаніхі» паводле Гогаля. Праўда, ёсць яшчэ «Ён і Яна» і «Вечнасць на дваіх» (рэжысёра Барыса Луцэнкі) і «Ідэальны муж» і «Пігмаліён» у пастаноўцы Аркадзя Каца, іншыя вядомыя назвы... І шкада, што няма сярод іх спектакля, які быў бы створаны ў гэтым нацыянальным тэатры з думкамі пра нашу краіну, якія, між іншым, былі на Горкаўскай сцэне...

Нехта скажа: «Беларуская драматургія — тэма для асобнага тэатра, які ў нас дзеля яе развіцця і прасоўвання і быў створаны». **Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі** пачыные новы сезон таксама ў жніўні. І адмысловым міжнародным праектам пад назвай «Тэатральны ваяж». Ініцыятары — грамадскае аб'яднанне «Тэатра» з Беларусі і асацыяцыя «Demain Le Printemps» з Францыі: іх намаганнямі створаны адмысловы спектакль, асноваў для якога сталі назіранні і замалёўкі з жыцця мінчан. Цікава ж, як нас бачаць артысты не толькі з Беларусі, але і іншых краін. Нам абяцаюць спектакль, дзе спалучаюцца драматургія, пластыка, акрабатыка, танец (27 і 28 жніўня). Але для адкрыцця ўласнага сезона ў тэатры ёсць музычная «Адвечная песня» Купалы.

У **Музычным тэатры Беларусі**, між іншым, ёсць пастаноўкі з нацыянальным абліччам. Але жнівень прапануе мюзікл папулярнага расійскага кампазітара Кіма Брэйтбурга «Блакітная камея» пра прэтэндэнтку на расійскі прастол князёўну Тараканаву і адноўлены «Бабін бунт» паводле «Данскіх апавяданняў» Міхаіла Шолахава.

Хто яшчэ не паглядзеў? Самы час для гэтага спектакля, жанр якога вызначаны як фарс-вадэвіль. У сённяшняй грамадскай сітуацыі ёсць нагода паразважаць пра Беларусь і магчымасці для яе развіцця.

Свае героі і свае характары ўвасоблены ў спектаклі «Несцерка» (паводле Віталя Вольскага) у **Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Якуба Коласа**, што працуе ў Віцебску. Тэатр трымае марку: менавіта гэтым спектаклем пачнецца 90-ты сезон.

Усё ж большасць тэатраў у краіне абуджаецца па-ранейшаму ў верасні. Вось толькі **Гродзенскі абласны драматычны тэатр** у апошнія выхадныя жніўня прапануе сваім гледачам камедыі паводле Рэя Куні (надзвычай папулярны ў нас аўтар) «Надта жанаты таксіст» і «№13». У Брэсце ўжо рыхтуюцца да міжнароднага фестывалю «Белая вежа» (на пачатку верасня). Міжнародная тэма ў Гомелі будзе раскрыта праз гастролі Арлоўскага дзяржаўнага тэатра «Вольная прастора». У сталіцы ў верасні гастролі Свярдлоўскага акадэмічнага тэатра музычнай камедыі. Гэта паўнавартасныя вялікія гастролі, цягам якіх нам прадставяць 10 назваў спектакляў, у прыватнасці мюзікл Максіма Дунаеўскага «Пунсовыя ветразі» паводле Аляксандра Грына (сына беларускага шляхціца, які быў высланы і застаўся ў Расіі). Спектакль пра тое, што нават самыя дзіўныя мары пра шчасце здзяйсняюцца. А мы так любім марыць...

Ларыса ЦІМОШЫК. *tsimoshyk@zviazda.by*

■ Вернісаж

«З ЗЯМЛІ ПАДЫМАЮ ЯБЛЫК...»



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Госці гэтага вернісажу, што прыспеў якраз да яблычнага Спасу, любаваліся крутабокімі падарункамі саду, якія, здаецца, толькі-толькі паклалі на шыкоўныя посцілкі, на стол і падаконнік, у кошык, і мастак яшчэ збіраецца перанесці іх абрысы на паперу. Але карціны ўжо віселі на сценах, а мастак прымаў віншаванні з нагоды здзяйснення сваёй мары і частаваў прысутных свежай садавіной. Так у Літаратурным музеі Максіма Багдановіча пачалася выстава акварэляў мастака Генадзя ЧЫСТАГА «З зямлі падымаю яблык...».

Чыстага добра ведаюць у краіне як таленавітага мастака-афарміцеля, дзякуючы якому з'яўліся цікавыя экспазіцыі ў многіх беларускіх музеях і ў Нясвіжскім палацы Радзівілаў. Удумліва і з асаблівай любоўю працуе ён у літаратурных музеях. Міцкевіч, Чорны, Багдановіч — у Ракуцёўшчыне і расійскім Яраслаўлі... Дзесяць музеяў і сто выстаў — такі «паслужны» спіс мастака-афарміцеля Генадзя Чыстага. А вось як майстра нацюрмортаў яго ведаюць менш, бо праз сціпласць ён не шмат выстаўляў свае светлыя, радасныя, амаль празрыстыя акварэлі. Гэтая «яблычная» выстава, вядома ж, дабавіць яму прыхільнікаў. Бо пачатак пачаткаў, любоў і спакуса, вечнасць і перасцярога, што сімвалізуе яблык, зразумелыя і блізкія кожнаму. І так будзе вечна, сцвярджае мастак гэтак жа, як паэт Кастусь Цыбульскі, радок якога і даў назву выставе: «З зямлі падымаю яблык — / Спелы румяны ранет, / Які быў пупышкай, / Стаў кветкай, / Звяліўся яблыкам... / І так мільёны гадоў».

Лідзія ПЕРАСЫПКІНА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 3 сентября 2015 года ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ С УСЛОВИЯМИ по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Реммех»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)				
№	Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов	Место-нахождение предмета торгов	Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
1.	Административное помещение общей площадью 289,3 кв. м, инвентарный номер 500/D-708145924 (назначение: административное помещение) 1-й этаж 4-этажного здания	г. Минск, ул. Бабушкина, 48-2	2 314 502 400	231 000 000
2.	Административное помещение общей площадью 402,8 кв. м, инвентарный номер 500/D-708145928 (назначение: административное помещение) 3-й этаж 4-этажного здания	г. Минск, ул. Бабушкина, 48-6	3 234 441 600	323 000 000
3.	Административное помещение общей площадью 408,9 кв. м, инвентарный номер 500/D-708145929 (назначение: административное помещение) 4-й этаж 4-этажного здания	г. Минск, ул. Бабушкина, 48-7	3 265 046 400	326 000 000

Наличие обременений: залог, аренда.

Продавец имущества: ОАО «Реммех», ул. Бабушкина, 48, 220024, г. Минск.

Организатор торгов: УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К.Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Реммех», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 15 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся **3 сентября 2015 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 24.08.2015 по 01.09.2015 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефону: (017)291-83-56, (029)697-93-09.

Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);
(017)296-35-94, (017)291-83-56, (029)697-93-09 (ОАО «Реммех»).

Ликвидатор объявляет о проведении 31.08.15 в 14.00 по адресу: Минск, Беды, 29-2Н
ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА
ООО «Топ Бетон»:

1) КОРОВНИК, 1602,6 кв.м, 1965 г.п., начальная цена 437 090 000 руб.;
2) ЗДАНИЕ КОТЕЛЬНОЙ, 79,8 кв.м, 1965 г.п., начальная цена 41 965 000 руб.

Недвижимые улучшения расположены на участке с/х назначения площадью 466,2670 га (кадастровый № 623684300001000112), адрес: **Минский р-н, д. Климовичи.** Шаг торгов – **5%**.
Задаток в размере 10% от начальной цены лота перечисляется на р/с 3012018490017 ОАО «Приорбанк» ЦБУ 116, код 749, УНП 190800527.
Заявления на участие в торгах направляются по адресу: **220002, Минск, а/я 33 в срок до 26.08.15 г.** Справки по тел. **8(029)628 59 69.** УНП 191228804

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703
Продавец	Открытое акционерное общество **«Трест Белтранссстрой»,** 220050, г. Минск, ул. Советская, 8
Лот № 1:	НЕЗАВЕРШЕННОЕ ЗАКОНСЕРВИРОВАННОЕ ЗДАНИЕ МАГАЗИНА (готовность – 67%), общей площадью 295 кв.м, инвентарный номер 240/U-31294, **г. Орша, пер. Луговой, 5 Б. Начальная цена с НДС 20% – 360 455 170 бел. руб. (снижена на 20%)**
Лот № 2:	СКЛАД СЫПУЧИХ МАТЕРИАЛОВ, общей площадью 126,3 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47336. **г. Брест, ул. Карасева, 100. Начальная цена лота с НДС 20% – 85 060 530 бел. руб. (снижена на 80%)**
Лот № 3:	РАСТВОРНЫЙ УЗЕЛ, общей площадью 498,7 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47330. **Начальная цена лота с НДС 20% – 421 152 420 бел. руб. (снижена на 80%)**
Лот № 4:	МЕХАНИЧЕСКИЙ СКЛАД ЦЕМЕНТА, общей площадью 45,2 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47322. **Начальная цена лота с НДС 20% – 38 941 170 бел. руб. (снижена на 80%)**
Лот № 5:	ЗДАНИЕ КОМПРЕССОРНОЙ СТАНЦИИ, общей площадью 62,4 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47332. **Начальная цена лота с НДС 20% – 174 060 320 бел. руб. (снижена на 50%)**
Лот № 6:	СКЛАД СУХИХ ЛЕСОМАТЕРИАЛОВ, общей площадью 501,7 кв.м, инвентарный номер: 100/С-47323. **Начальная цена лота с НДС 20% – 845 503 720 бел. руб. (снижена на 50%)**

